У цэнтры якасныя аднапакаёвыя кватэры таксама сёння падаражэлі. Насамрэч студэнтам дарагія кватэры здаваць ніхто не збіраецца, аднак на хвалі ажыятажу яны ўжо сёння каштуюць ад 350 да 500 долараў. Праўда, пакуль што кватэры па такім кошце на рынку прыцэньваюцца «вісяць».

Крыху павялічыўся кошт і на двухпакаёвыя кватэры, якія сёння прапануюцца ўжо за 280—300 долараў. У спальных раёнах «двушкі» каштуюць каля 300-350 долараў, а ў цэнтры — каля 400—450.

Самымі таннымі сёння застаюцца вялікія па агульнай плошчы трохпакаёвыя кватэры ў новабудоўлях. Без мэблі такія кватэры каштуюць каля 300—320 долараў плюс кватплата. Для студэнтаў з грашыма такія варыянты не зусім падыходзяць, бо ім трэба ўжо ўпарадкаванае жыллё, таму такое здаюць у групе з 3—4 чалавек.

Аднак на таннае і шматпакаёвае жыллё існуе сёння не толькі попыт з боку грамадзян краіны. Апошнім часам кітайскія студэнты чацвёртага курса ўжо не жадаюць жыць у інтэрнатах. Яны заказваюць у агенцтвах двух- ці трохпакаёвыя кватэры ў Малінаўцы, дзе пакуль дрэнныя транспартныя зносіны ў сувязі з будаўніцтвам метро, па кошце да 300 долараў. Такія заказы выконваюцца не адразу, бо большасць уладальнікаў здаюць кватэры выключна славянам.

### АРЭНДУ КВАТЭРЫ ЛЕПШ ФІКСАВАЦЬ У ЖЭСе

Пасля таго, як спецыяліст агенцтва нерухомасці паказвае кліенту кватэру і дамаўляецца пра ўмовы арэнды і кошт паслуг, будучы кватарант пакідае гаспадару залог пад распіску (звычайна гэта каля 100 долараў). Поўную таксу за месяц кватарант плаціць пасля таго, як ён гэты месяц пражыве. Бываюць выпадкі, калі гаспадар патрабуе аванс за месяц, або нават за 3 ці 6 месяцаў. Такія нюансы вырашаюцца непасрэдна паміж гаспадаром і кватарантам, аднак спецыяліст агенцтва павінен запытаць у арэндадаўцы дакументы на кватэру, каб выключыць магчымасць махлярства свайго кліента.

Махлярства і не будзе, калі пасля вуснай дамоўленасці паміж кліентам і ўласнікам кватэры гэтую арэнду афіцыйна зарэгіструюць у ЖЭСе. І толькі пасля ўсяго гэтага кватарант разам са спецыялістам афармляе ў агенцтве нерухомасці здзелку і аплачвае за паслугі 350 тысяч рублёў.

Рэгістрацыя здзелкі арэнды ў ЖЭСе абараняе інтарэсы і ўласніка, і кватаранта. Без такой рэгістрацыі кватаранта могуць папрасіць пакінуць жылое памяшканне на працягу 24 гадзін нават зімой. Зарэгістраваны дагавор дазваляе ціхім кватарантам шукаць новае жыллё на працягу трох месяцаў, а ў гэты час кошт арэнды павялічвацца не можа. З іншага боку, гаспадару будзе зусім не даспадобы пазачарговае знаёмства з падатковым інспектарам. А гэта можа здарыцца ў любы момант, калі паміж кватарантамі і суседзямі прабяжыць чорны кот. Суседзі лёгка могуць паведаміць куды трэба, што кватэра здаецца незаконна. Бываюць выпадкі, калі кватаранты пашкоджваюць бытавое абсталяванне ў кватэры, але адмаўляюцца плаціць за яго, бо могуць прыстрашыць гаспадароў падатковай інспекцыяй.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Марыя ЕСЬМАН:

# «ДВА ТЫДНІ Ў ПРАКУРАТУРЫ, ДВА ТЫДНІ — У СУДЗЕ...»

**Яшчэ год назад прозвішча 19-гадовай Марыі Есьман было вядома толькі ў вузкіх колах: скончыўшы мадэльныя курсы Сашы Варламава, некаторы час разам з яго лепшымі мадэлямі, дзяўчына ездзіла на паказы ў вядучыя еўрапейскія краіны. У астатнім жыццё беларускай студэнткі ішло размерана: дом—універсітэт—дом. Але ўсё змянілася пасля таго, як дзяўчына прыйшла на нацыянальны адбор конкурсу «Міс Інтэркантыненталь»...**

**Сёння Марыя Есьман — першая прыгажуня Еўропы і дзейная першая віцэ- «Міс Інтэркантыненталь». Пра тое, як змянілася жыццё дзяўчыны праз год пасля ўдзелу ў буйнейшым конкурсе прыгажосці, Марыя расказала нашай газеце. Падчас гутаркі карэспандэнт «Звязды» даведаўся, чаму на кастынгах «Міс Беларусь» дзяўчыну называлі катом Леапольдам, дзе Марыя харчавалася смаўжамі, і што яна рабіла два тыдні ў судзе ...**

### «ДВА ТЫДНІ Ў ПРАКУРАТУРЫ — ПРАВОДЗІЛА ДАЗНАННІ»

**— Узгадай, калі ласка, свае першыя ўражанні пасля фінішу праекта «Міс Інтэркантыненталь»? Усё ж такі цэлы месяц вы правялі разам, а пасля раз — і ўсё скончылася.**

— Насамрэч першыя ўражанні атрымаліся трошкі размытымі і сумбурнымі. На наступны дзень пасля конкурсу мы ўсе адсыпаліся. Стаміліся страшэнна. Тым больш ты настолькі ў прастрацыі, што тое, што адбылося, пачынаеш усведамляць толькі праз тыдзень... Вядома, калі мы развітваліся, было даволі складана, за гэты час мы паспелі добра пасябраваць.

А праз два дні я прыйшла ва ўніверсітэт...

**— І як цябе сустрэлі? Ці ішлі выкладчыкі на ўступкі, даючы першай прыгажуні Еўропы якіясьці бонусы?**

— Віншавалі і аднакурснікі, і выкладчыкі. Сустрэлі мяне вельмі добра: «Наша Маша — малайчына!». Што да вучобы, то я старалася нагнаць усё, што прапусціла. Здаецца, атрымалася. Выкладчыкі ставіліся да мяне, як і да астатніх студэнтаў. І гэта правільна, я лічу. Пасля таксама запрашалі ў журы конкурсу «Міс і Містар юрфак». Але судзіць было няпроста — удзельнічала шмат знаёмых.

Нядаўна праходзіла практыку ў пракуратуры (два тыдні ў пракуратуры, два тыдні ў судзе), праводзіла дазнанні. Апытвала сведкаў — усё як трэба. Вельмі цікава. Хоць аб прафесіі юрыста я марыла з пятага класа, цяпер усё часцей усведамляю, наколькі гэта складаная прафесія. Тут патрэбны халодны розум, каб рассудзіць умела, правільна і лагічна. Я ж усё люблю мераць на сабе, таму псіхалагічна прыходзіцца няпроста. Але паглядзім, магчыма, у мяне атрымаецца сябе перайначыць.

### МАДЭЛЬНАЯ ДАРОГА ЦІ НАВУКОВАЯ?

**— Ці падтрымліваеш кантакт з «інтэркантынентальнымі» прыгажунямі ?**

— Так, нядаўна перапісваліся з дзяўчынай з Украіны. Увогуле мяне ўсе завуць у «Фэйсбук» (facebook — сацыяльная сетка кшталту vkontakte — **Аўт.**). Але мяне няма ні ў «Фэйсбуку», ні ў «Кантакце». Але прыемна, што завуць, не забываюцца. Венесуэлка запрашала мяне неяк на свой Дзень нараджэння, але я не рызыкнула ехаць.

**— Твае асабістыя развагі пра выпікі конкурсу: як на фоне астатніх глядзелася пераможца Ханэлі Кінтэра і якімі былі ўзаемаадносіны паміж канкурсанткамі?**

— Першапачаткова канкурсанткі з Венесуэлы не было. Яна пад'ехала пазней. Але яна жанчына, статная — я побач з ёй здавалася сабе дзіцем *(усміхаецца)*. А Ханэлі насамрэч смяшлівая і з запалам. Яна мне спадабалася. Адзіная нязручнасць — мы не маглі паразумецца, бо Ханэлі не разумела англійскай, толькі іспанскую. Таму размаўлялі праз перакладчыка, а гэта не зусім зручна. У цэлым жа венесуэлка вельмі яркая (і апраналася заўсёды ярка), у яе заўсёды быў асаблівы парфум. Я лічу, усё было правільна. Ханэлі сумленна заслужыла гэты тытул. Яна і працавала дзеля гэтага вельмі шмат, мела ўжо вялікі вопыт.

**— Якія маеш планы далей: мадэльная дарога ці навуковая?**

— Заракацца нельга, таму гэтае пытанне я пакіну адкрытым. Не таму, што нешта ўтойваю, а таму, што яшчэ сама не вырашыла.

**— А як наконт стварэння сям'і?**

— Зразумела, хачу сям'ю, але спачатку трэба давучыцца. Пакуль ранавата.

**— А прэтэндэнты ёсць?**

— Шмат хлопчыкаў-сяброў, але толькі як сяброў.

**— Калі табе раптам патэлефануюць і скажуць: Маша, заўтра кастынг на конкурс «Топ-мадэль». У цябе ёсць рэальныя шансы на перамогу. Як адрэагуеш?**

— Спачатку трэба будзе ўсё ўзважыць: калі, што, як. А ўжо тады казаць. Усё гэта няпроста, бо не ведаеш, што цябе чакае наперадзе.

### «ЖАБІНЫЯ ЛАПКІ ЕЛА З ЗАДАВАЛЬНЕННЕМ»

Зусім нядаўна дзяўчына вярнулася са здымкаў новага сезона «Бітвы тытанаў». Разам з беларускімі спартсменамі, медыяперсонамі і зоркамі эстрады, два тыдні Марыя правяла пад Парыжам, змагаючыся за перамогу з прадстаўнікамі каманд Расіі, Францыі і Кітая. Чым усё скончылася, мы даведаемся ў тэлевізійнай версіі праекта, які з верасня стартуе на «АНТ».



— Спачатку было вельмі весела: ехалі — усю дарогу песні спявалі, — дзеліцца ўражаннямі дзяўчына. — Але як толькі прыехалі, цяжкавата было адразу з адаптацыяй. Хоць розніца ў часе і невялікая, але яна адчувалася. Тым больш што і клімат там іншы. Уставалі рана, вярталіся вельмі позна. Зразумела, стамляліся. Але стома гэтая была прыемная. У Францыі я ўпершыню паспытала смаўжоў і жабіныя лапкі. Першы раз у жыцці! Морапрадукты я люблю, таму з вялікім задавальненнем гэта ела і мне падабалася.

**— Гэта было тваё першае наведванне Парыжа?**

— Так, у Парыжы я была першы раз. Але прыемней было пабачыць не столькі Эйфелеву вежу, як Сабор Парыжскай Божай Маці. Калі я туды зайшла, там яшчэ была служба — званілі ў званы. Мне адразу на памяць прыйшлі вобразы з дзяцінства: калі была маленькай, я яскрава ўяўляла сабе і Эсмеральду, і Квазімоду. А калі стаіш на гэтым месцы ў рэальнасці і чуеш гэтыя званы — адымае мову, такі шок — але шок прыемны. Была таксама ў Луўры, бачыла «Мону Лізу». Прыгожа.

**— Якой была атмасфера ўнутры каманды?**

— Хачу адзначыць, што беларусы гучней за ўсіх перажывалі за сваіх. Гэта было вельмі прыемна назіраць з боку. Пасля нават галоўны французскі рэферы падыходзіў, сказаў, што ў Беларусі самыя прыгожыя балельшчыцы. Гэта паездка ўвогуле вельмі адкрыла людзей. Мы пасябравалі. Да мяне многія падыходзілі і казалі, што я іх прыемна здзівіла. Маўляў, насамрэч я добры чалавек, а не такая, якой яны ўяўлялі.

### «САШУ ВАРЛАМАВА Я ВЕЛЬМІ ЛЮБЛЮ»

**— Ты была ў камандзе пераможцаў спецпраектаў канала АНТ — разам з «Міс Беларусь-2010» Людмілай Якімовіч. Я ведаю, што падчас кастынгаў на «Міс Беларусь» ты была ў складзе журы. Якія засталіся ўражанні?**

— Насамрэч было вельмі цяжка выбіраць. Я і сёння не разумею, як можна выбраць самую прыгожую дзяўчыну. Гэта вельмі цяжка, бо ў кожнай ёсць свая адметная «разынка». Мяне пасля нехта нават катом Леапольдам назваў, таму што я казала: «А давайце гэту дзяўчыну возьмем таксама — яна такая прыгожая. А ў гэтай такія валасы шыкоўныя, а ў гэтай вочы, а гэтая размаўляе цудоўна. Давайце і іх возьмем». У выніку з мяне ўсе смяяліся, бо я хацела ўзяць усіх.

**— Яшчэ год назад ты таксама была ў гэтай ролі. Можа, праводзіла якіясьці паралелі?**

— Я проста прасцей да ўсяго ставілася б. Многія дзяўчаты падчас кастынгаў моцна крыўдзіліся, што іх не бяруць далей. Калі б мне сказалі «не», я б не засмучалася: не, дык не. Гэта, вядома, было б непрыемна. Але трэба старацца перажыць такія моманты.

**— Часта цябе называюць мадэллю, якая выйшла з мадэльнай школы Сашы Варламава. Ці падтрымліваеш ты кантакты з гэтым агенцтвам? І якія ў вас узаемаадносіны сёння?**

— Насамрэч Сашу Варламава я вельмі люблю. Ён вельмі незвычайны чалавек, а я люблю такіх людзей. Спачатку мне было трохі не па сабе, думала: ну вось, усе неяк на мяне пакрыўдзіліся. Нейкае неадназначнае было адчуванне. Але была прыемна здзіўленая, калі пасля зусім выпадкова мы сустрэліся з Сашам у журы конкурсу «Міс Інстытут культуры». Добра так з ім пагаварылі. Мне было прыемна, засталася задаволенай. Вядома, падтрымліваю адносіны з мадэлямі Варламава, таму што там засталося шмат маіх сяброў. Тэлефануем адзін аднаму, сустракаемся. Падчас сёлетняга «Еўрабачання» ўсе разам мы сядзелі ў кавярні і хварэлі за нашых «Батэрфляйс». Усё было добра. Так, як я люблю: дружна і без скандалаў.

**Гутарыў Ілья ЛАПАТО.**

Пазнай свой край

# БУЛГАРЫ ЁСЦЬ... У БЕЛАРУСІ

Пошукі на сучасных мапах не прынясуць аніякага выніку, і тым не менш існуе дакладны гістарычны факт: у часы ранняга сярэднявечча Вялікая Булгарыя не без падстаў лічылася адной з наймагутнейшых дзяржаў свету. А самі булгары — адным з найбольш шматлікіх народаў. Аднак сёння ўсё гэта — ужо ў мінулым. Афіцыйна такой краіны і такога народа даўно няма, праўда, большасць даследчыкаў прызнае булгар прамымі продкамі цяперашніх волжскіх татар. І ўсё ж спяшацца з нейкімі высновамі — справа не заўсёды ўдзячная. Насуперак скептыкам, булгары не зніклі. І адшукаць іх можна ў нашай Беларусі.

### ПРА БЛЫТАНІНУ І «ТАТАРСКІЯ СЛЯДЫ»

Каб «праверыць» іх існаванне, можна абысціся без значных выдаткаў часу і грошай. Спачатку неабходна дабрацца да Асіповічаў. А ад райцэнтра пераадолець з дзясятак кіламетраў у паўднёва-ўсходнім напрамку амаль паралельна аўтатрасе Мінск—Гомель. Арыенцірамі стануць вёскі Замошша і Літвінава. Ад апошняй канчатковая мэта ўжо зусім блізка. Адно, што апошні кіламетр шляху ад Літвінава давядзецца праехаць па гравійцы. Пры гэтым, каб «не праспаць» патрэбны паварот налева, тут ні ў якім разе нельга надта спяшацца — указальніка на вёску Булгары проста няма.

Зрэшты, з улікам невялікіх адлегласцяў, асаблівых праблем з пошукамі ўзнікнуць не павінна. Складаней з незвычайнай назвай. Так, многія з мясцовых жыхароў заўважаюць: некалі, з-за няўрадлівай пясчанай глебы, гэтую вёску ведалі як Пясчанку. І змяніла яна сваё «імя» на Булгары толькі з прычыны адвечнай блытаніны — так здарылася, што Пясчанкі на Асіповіччыне было адразу дзве.

Але сёй-той перакананы і ў іншым: назва вёскі магла ўзнікнуць якраз у сувязі з перасяленнем сюды некалькіх сем'яў волжскіх булгар. І хоць якіх-небудзь пісьмовых пацверджанняў гэтай версіі не існуе, адназначна адкідваць яе таксама не хочацца. Ужо таму, што «цюркскае» паходжанне мае назва яшчэ аднаго населенага пункта раёна — пасёлка Татарка. Да таго ж месцяцца Татарка і Булгары амаль што побач.

### АЎТАКРАМА ПЛЮС ЧЫГУНКА

Лічыцца, што свой пачатак Булгары бяруць недзе ў канцы пазамінулага стагоддзя. Прычым вялікай вёска не была ніколі. Так, можна заўважыць, што нават у перыяд найбольшага «росквіту» ў 1920-х гадах колькасць яе насельніцтва набліжалася да сотні жыхароў. Але пры гэтым стаяла тут... усяго 17 хат. Зразумела, што з цягам часу сам па сабе малюнак змяніўся. І ўсё ж не вельмі істотна. Сёння «жылых» двароў у Булгарах налічваецца роўна дзесяць, а колькасць вяскоўцаў — тры з паловай дзясяткі чалавек.

Да слова, менавіта невялікія памеры і вызначылі агульную сітуацыю з інфраструктурай. Ва ўсе часы яе тут проста не было: школа, дзіцячы сад, крама, Дом культуры заўсёды знаходзіліся ў суседніх вёсках — Лучыцы і Замошша. Да «адметнасцяў» жа Булгараў можна аднесці хіба што аўтакраму. А яшчэ невялікую адлегласць ад чыгуначнай веткі Асіповічы — Магілёў. Пры гэтым падобная акалічнасць магла адыграць у гісторыі вёскі і па-сапраўднаму драматычную ролю. У Вялікую Айчынную вайну навакольныя непраходныя лясы ўпадабалі партызаны. А ў адказ на іх дзейнасць немцы распачалі сумнавядомую «зачыстку тэрыторыі».

— Я была яшчэ малая, але памятаю той дзень вельмі добра: прыехала вялікая крытая машына, з яе павыбягалі немцы з сабакамі, пачалі хапаць усіх і пытацца, дзе партызаны, — узгадвае 75-гадовая жыхарка вёскі Булгары Таццяна Гаўрылаўна Дуванава. — А як ніхто нічога не сказаў, то людзей сагналі ў дзве хаты, прынеслі саломы і ўжо хацелі паліць. І мо мы б сапраўды загінулі, каб не шчаслівы выпадак: праз вёску ехалі вайскоўцы — казалі, што былі гэта нейкія мадзьяры. Дык вось тыя мадзьяры спыніліся і пачалі сварыцца з немцамі, маўляў, жывых людзей паліць нельга, людзі ні ў чым не вінаватыя. І немцы нас выпусцілі. Але папярэдзілі, што калі на чыгунцы зноў распачнуцца выбухі — то яны абавязкова вернуцца. Таму як толькі прагучалі чарговыя выбухі, мы ўжо нікога не чакалі — адразу ж разбегліся, хто куды.

І ўсё ж чыгунка — перавага бясспрэчная. Так, варта заўважыць, што некаторым з мясцовых жыхароў яна давала працу. А многім — і дадатковую крыніцу даходаў. Дзякуючы някепскім і да таго ж адносна танным транспартным зносінам улетку ёсць магчымасць сабраць, а затым і прадаць грыбы-ягады — кажуць, што навакольныя лясы асабліва багатыя на лісічкі, баравікі і чарніцы.

### З КАНЯМІ. І НЕ СУПРАЦЬ САЛА

Пры ўсім жаданні, тут не пачуеш татарскай мовы, не знойдзеш мячэці і нават не сустрэнеш ніводнага прыхільніка казанскага «Рубіна». Тут ніколі не гатавалі бай-мал — цікавую па смаку сумесь масла з мёдам. Затое заўсёды трымалі свіней і, вядома ж, былі зусім не супраць сала.

Аднак прасачыць пэўныя «паралелі» з традыцыямі татар таксама можна. Старыя людзі сцвярджаюць, што некалі мясцовая гаспадарка спецыялізавалася на жывёлагадоўлі, мела шмат кароў і, амаль што паводле «класікі жанру», коней. Конь на прыватных сядзібах вяскоўцаў — з'ява нярэдкая і сёння.

— У мяне ёсць і агарод, і карова, і конь, — заўважае Таццяна Дуванава. — Ці цяжка спраўляцца? А што тут цяжкага — галоўнае, накасіць сена. Ды і немагчыма ў гаспадарцы без каня, тым больш што конь добры — самі яго навучалі. І ўвогуле, мы да ўсяго звычныя. Некалі трымалі нават тры каровы, бо было неабходна гадаваць чацвёра сыноў. Гэта вы цяпер маеце па адным дзіцяці, і лічыце, што гэтага больш чым дастаткова, маўляў, «інакш дзяцей не апранеш». А мы ж на тую вопратку тады і не зважалі — мы проста працавалі.

Ці не ўсе жыхары Булгараў сёння — пенсіянеры. Аднак сама вёска пакрысе пачынае змяняцца, дзе-нідзе нават з'яўляюцца новыя зрубы. Бо частка мясцовага насельніцтва — гэта так званыя «дачнікі». Некаму з іх хаты засталіся ў спадчыну, але хтосьці дамы і купляў. Няхай сабе тут няма вялікай рэчкі ці добрай рыбалкі, але ж да райцэнтра і чыгункі даволі блізка. Апроч таго, не апошнім аргументам становяцца і па-сапраўднаму смешныя па сталічных мерках цэны на нерухомасць.

— Татары? — перапытваецца Таццяна Дуванава. — Не, асабіста я іх тут не бачыла. Але і не скажу, што ў Булгарах жыве толькі адзін народ. У свой час я працавала рабочай у адной з бліжэйшых вайсковых часцей і там жа знайшла сабе мужа з Расіі. Таму мы падумалі і вырашалі: запісаць двух сваіх сыноў па мне беларусамі, а яшчэ двух — па мужу рускімі. Такі вось атрымаўся «інтэрнацыянал».

**Сяргей ГРЫБ.**
*Асіповіцкі раён.*

Як нас дураць

# ДЗЯЎЧАТ ПАДМАНВАЮЦЬ НА САЙТАХ ЗНАЁМСТВАЎ

**Даверлівыя жыхаркі Оршы і Віцебска сталі ахвярамі падману з боку махляроў у сферы «віртуальных тэхналогій».**

Як паведаміў «Звяздзе» пракурор аддзела па наглядзе за дазнаннем **пракуратуры Віцебскай вобласці Мікалай ЛАЗАРЭНКА**, зламыснікі называліся эмігрантамі з Расіі, якія цяпер жывуць у краінах Еўрасаюза.

Безумоўна, спачатку пры перапісцы яны літаральна «засыпалі» беларускіх прыгажунь кампліментамі, прызнаваліся ў тым, што проста марылі аб такім цудоўным знаёмстве...

А як жа «хацелася» мужчынам зрабіць такой прыгажосці, феі, музе, каралеве, багіні шчодры падарунак? Але як?

Пісалі, што, маўляў, твой падарунак адпраўлены праз спецыяльную службу дастаўкі. І для яго атрымання ўсяго толькі трэба заплаціць невялікую суму грошай. Маўляў, потым, пры асабістай сустрэчы, грошы гэтыя вернуцца, так пісалі махляры.

І нашы даверлівыя суайчынніцы пералічвалі грошы адным з прапанаваных спосабам электронных плацяжоў. Пералічвалі і 85 тысяч, і 120... Дарэчы, не толькі жыхаркі паўночнай вобласці нашай краіны сталі ахвярамі махлярства. Такім жа чынам «кінулі на грошы» жыхарку Брэсцкай вобласці. Узрост ахвяраў віртуальнага кахання розны. Напрыклад, адной даме ўжо за трыццаць...

Каб незаконна атрымаць грошы, махляры ў сферы так званых высокіх тэхналогій не лянуюцца ствараць і размяшчаць свае сайты ў сеціва, часта вельмі падобныя на ўжо раскручаныя з добрай рэпутацыяй розных добрасумленных службаў дастаўкі тавараў. Паколькі для рэгістрацыі запісаў уліку і электронных кашалькоў у плацежных сістэмах часта дастаткова назваць прыдуманыя звесткі аб карыстальніку, а зняцце пераведзеных грошай можна ажыццявіць рознымі спосабамі за межамі нашай краіны, раскрываць такія злачынствы праваахоўным органам даволі цяжка. Таму ў абласной пракуратуры раяць быць пільнымі і асцярожнымі. І, зразумела, не страчваць галаву ад віртуальнага кахання.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Памяць

# «Калі шаснаццацігадовы хлопец падымае астанкі сваіх продкаў, з ім нешта адбываецца...»

**Навошта пошукавы атрад «Уралец» з Чалябінскай вобласці прыехаў у беларускую вёску Рацічы?**



26 ліпеня каля аўтамабільнай дарогі побач з вёскай Рацічы Гродзенскага раёна ўстаноўлены крыж у памяць аб вайскоўцах 336-га Чалябінскага пяхотнага палка расійскай імператарскай арміі, якія загінулі ў гэтых мясцінах у лютым 1915 года. Уверсе крыжа — металічная ікона заступніка Уральскага рэгіёна Сімяона Верхатурскага, якую прывёз з Чалябінскай вобласці ў Беларусь ваенна-гістарычны пошукавы атрад «Уралец».

**Кіраўнік аддзела Гродзенскай праваслаўнай епархіі па ўзаемадзеянні з Узброенымі Сіламі Рэспублікі Беларусь протаіерэй Аркадзь Касьяненка** правёў абрад асвячэння крыжа і малітву. А затым і ён, і прадстаўнікі мясцовай улады, абласнога ваенкамата выказалі шчырую ўдзячнасць вайскоўцам беларускага 52-га спецыялізаванага пошукавага батальёна і расійскага пошукавага атрада «Уралец», якія каля месяца пляча ў пляча працавалі на раскопках паблізу Рацічаў і знайшлі больш за сорак астанкаў загінулых воінаў.

«Служым народам Беларусі і Расіі!» — казалі ў адказ юныя расіяне, атрымаўшы за сваю працу падарункі, граматы і падзячныя лісты, у тым ліку і іх бацькам. З гарачым жаданнем, кажа **кіраўнік атрада «Уралец» Барыс Чыгірын,** вернуцца сюды наступным летам, паколькі зроблены толькі першыя крокі па ўвекавечанні памяці салдатаў і афіцэраў, якія загінулі ў гэтых мясцінах у полымі Першай сусветнай вайны. Наступныя крокі, дарэчы, будуць зробленыя ўжо ў сёлетнім пошукавым сезоне вайскоўцамі 1-й спецыялізаванай роты 52-га батальёна.

**Гістарычная даведка**

У лютым 1915 года на подступ*ах да Гродна разгарэліся жорсткія баі, звязаныя з адступленнем 10-й рускай арміі пад камандаваннем генерала Сіверса з Усходняй Прусіі, якая здавала адну пазіцыю за другой. Нямецкія войскі занялі Ліпск, Сапоцкін, выйшлі да Нёмана ў ваколіцах Гожы і распачалі артылерыйскі абстрэл пазіцый фартоў Гродзенскай крэпасці.*

*Асабліва кровапралітныя баі разгарнуліся ў раёне вышыні 200,3 каля вёскі Рацічы. Немцы ўстанавілі на ўзвышшах некалькі дзясяткаў кулямётаў сістэмы «Максім» і бязлітасным агнём расстрэльвалі вайскоўцаў 336-га Чалябінскага пяхотнага палка. «Чалябінцы» імкнуліся дэблакаваць і забяспечыць прарыў з Аўгустоўскага канала 20-му корпусу генерала Булгакава, які ваяваў у складзе 10-й арміі. За трое сутак, з 10 па 13 лютага 1915 года, каля Рацічаў загінула больш за тры тысячы салдатаў і афіцэраў 336-га Чалябінскага палка* **(паводле гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Гродна»).**

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**

# «Калі шаснаццацігадовы хлопец падымае астанкі сваіх продкаў, з ім нешта адбываецца...»

**(Заканчэнне.**
**Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**



...Сённяшнім чалябінцам з пошукавага атрада «Уралец» — ад чатырнаццаці да сямнаццаці гадоў, яны вучацца ў школах і каледжах горада Азёрска і іншых населеных пунктаў Уральскага рэгіёна. Хлопцы не надта атлетычнага целаскладу, але, як можна было пераканацца ў іх лагеры, што размясціўся ў суседняй з Рацічамі вёсцы, дысцыплінаваныя і працавітыя. Тыя, хто ў той дзень былі ў нарадзе, займаліся ўборкай тэрыторыі, дастаўкай вады, дроў, а іншыя атрадаўцы пасля працы на раскопках зноў паехалі ў Гродна, дзе ім вельмі спадабалася пасля наведвання фестывалю джазавай музыкі. Гасцінныя гаспадары паказалі ім таксама Новы і Стары замкі, іншыя гістарычныя аб'екты горада над Нёманам, Жыровіцкі манастыр, Аўгустоўкі канал, запрасілі на свята вызвалення Гродна ад фашыстаў...

Чаму юныя расіяне праводзяць свае летнія канікулы менавіта тут, у Рацічах?

— У нас — патрыятызм, мы хочам знайсці астанкі сваіх продкаў і, магчыма, устанавіць іх асобы, — як падалося, шчыра, без нейкай гульні на публіку адказвае **адзін з курсантаў «Уральца» Андрэй ЕЎДАКІМАЎ**. — Для гэтага мы нават частку транспартных расходаў аплацілі сваімі грашыма. Я на раскопках першы год, а наш **камандзір атрада Уладзімір КУЗНЯЦОЎ** знаходзіцца ўжо ў пятай экспедыцыі.



Як потым высветлілася, камандзір «Уральца» перайшоў у дзясяты клас і ў свае шаснаццаць гадоў ужо мае расійскі медаль «За ратную доблесть», а пасля заканчэння школы хоча паступаць у ваеннае вучылішча.

Чаму базавым для «Уральца» стаў менавіта горад Азёрск? А таму, што тут жыве арганізатар і кіраўнік атрада, знаўца ваеннай гісторыі Барыс Чыгірын, якому, дарэчы, за працу па патрыятычным выхаванні моладзі казакі прысвоілі званне вайсковага старшыны Азёрскай станіцы.

— Мая пошукавая дзейнасць пачалася з удзелу ў экспедыцыі каля вёскі Альхаватка, дзе 6-я панцырная дывізія Вермахта ў абход Дона рвалася да Сталінграда, — расказвае Барыс Юр'евіч. — Тут нашы штрафбаты стаялі насмерць, у дзень гінула па пяць тысяч чалавек. І не прапусцілі ворага. Пад уражаннем ад гэтай экспедыцыі і ўзяўся за арганізацыю пошукавага атрада ў Азёрску, прычым з так званых «цяжкіх» падлеткаў. Вынік? Трэба бачыць вочы гэтага хлопца, які падымае астанкі сваіх продкаў, якія загінулі 95 гадоў таму, таксама маладых людзей. Здараецца, ён гадзіну, дзве, тры маўчыць, знаходзіцца толькі сам з сабою, нават у дэпрэсіі. Але затым з ім нешта адбываецца, у яго з'яўляюцца думкі на перспектыву. Якім быць дома? З якімі сябрамі варта развітацца, а якіх пакінуць? Якую прафесію выбраць? Дарэчы, з больш чым 180 падлеткаў, што за гэтыя гады прайшлі праз «Уралец», толькі адзін вярнуўся на лаву падсудных. Першы камандзір Дзяніс Малаканаў — следчы райаддзела ўнутраных спраў. Сярод нашых выхаванцаў — восем юрыстаў, дванаццаць інжынераў, сем педагогаў, многія паступаюць у ваеннае вучылішча.

— «Уралец» ужо пятае лета запар працуе на вайсковых пахаваннях у Беларусі. З чаго пачыналася?

— Я даведаўся, што ў Беларусі ёсць спецыялізаваны пошукавы батальён, узяў і напісаў Прэзідэнту Лукашэнку з прапановай паўдзельнічаць у раскопках на месцах баёў. І ўжо праз два тыдні атрымліваю адказ са словам «Дабро». Потым звязваюся з Упраўленнем па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяраў войнаў Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь, і ў 2006 годзе мы прыязджаем у Мазыр. Пакідаю хлопцаў на вакзале, а сам накіроўваюся ў ваенкамат. «Вас ужо чакаюць», — кажа дзяжурны, і насустрач выходзіць начальнік вышэйзгаданага ўпраўлення палкоўнік Віктар Шумскі. Так завязалася наша дружба. За перыяд пошукавай працы ў розных рэгіёнах Беларусі з нашым удзелам знойдзены дзясяткі астанкаў ваеннаслужачых. Акрамя таго, да нас звяртаюцца сваякі без весткі зніклых воінаў, і з дапамогай беларускіх сяброў нам удалося ўстанавіць, дзе пахаваныя больш за 180 абаронцаў Айчыны. Дарэчы, у Азёрску жывуць двое вашых партызанаў. Яны 60 гадоў пражылі па-суседску ў нашым горадзе, не ведаючы адзін аднаго, хоць, як аказалася, былі ў адной брыгадзе. Аднаго з іх мы прывезлі на Віцебшчыну, дзе ён ваяваў.

**<u>Камандзір 1-й роты 52-га спецыялізаванага пошукавага батальёна капітан Іван ЦЁТУШКІН:</u>**

— У выніку пошукавых работ у раёне вёскі Рацічы сумесна з ваенна-гістарычным атрадам «Уралец» (пры гэтым патрабаванні да бяспекі вельмі строгія: мінашукальнікам правяраецца кожны, прыкладна 45-сантыметровы, слой зямлі, і так дакапваюцца да трох метраў у глыбіню — **Б.П.**) выяўлена 47 астанкаў ваеннаслужачых расійскай імператарскай арміі, якія загінулі ў лютым 1915 года. Сярод знойдзеных прадметаў — крыжыкі, металічныя абразкі, абутак (дарэчы, у добрым стане), гузікі з двухгаловым арлом, лыжкі, нажніцы, напарстак, какарда расійскага унтэр-афіцэра, манеты пачатку XX стагоддзя, гільзы ад вінтоўкі Мосіна і нямецкага карабіна, нямецкія штык-нож і свісток, з дапамогай якога, верагодна, падаваліся нейкія каманды... Пахаванні ў гэтых мясцінах знаходзяцца ў курганах, і пакуль мы цалкам раскрылі толькі два, а іх тут восем. Таму раскопкі будуць прадоўжаныя.

Прычым непачаты край пошукавай працы — не толькі каля Рацічаў.

**<u>«Звяздовец», краязнаўца Вітольд ІВАНОЎСКІ:</u>**

— Паблізу Рацічаў загінула прыкладна тры тысячы ваеннаслужычых расійскай імператарскай арміі, а ў раёне Аўгустоўскіх лясоў, вёсак Галынка, Маркаўцы, Багатыры Лясныя, па адных звестках, каля 20 тысяч, а па другіх — каля 30 тысяч салдатаў і афіцэраў 20-га корпуса генерала Булгакава. На палях паміж Сапоцкінам, Аўгустоўскім каналам і фартамі Гродзенскай крэпасці вечны спакой знайшлі людзі з розных рэгіёнаў Расійскай імперыі, розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў. Калісьці там былі брацкія магілы і нават могілкі, а цяпер засталіся хіба што невялікія пагоркі, аб паходжанні якіх мала хто ведае. Хоць гэта — наша гісторыя, з павагай да якой ставяцца нават у Германіі. Начальнік германскага генштаба пісаў у сваім дзённіку: «У страшэнных баях пад Гродна з 20-м корпусам рускай 10-й арміі мы прайгралі. Выдатна задуманая Аўгустоўская аперацыя скончылася для дзвюх нашых армій толькі маленькай тактычнай перамогай. Ужо 2 сакавіка рускія перайшлі ў наступ, і мы пачалі адыход да мяжы Германіі. Схіляю галаву перад асабовым саставам расійскага 20-га корпуса 10-й арміі».

Такім чынам, у 52-га батальёна іх памочнікаў з ваенна-гістарычнага атрада «Уралец» (а можа, і іншых?) наперадзе працы не на адзін пошукавы сезон. Мяркую таксама, што ў Гродзенскім Свята-Пакроўскім кафедральным саборы варта ўстанавіць памятную дошку аб ваеннаслужачых, якія загінулі ў баях Першай сусветнай вайны на тэрыторыі цяперашняга Гродзенскага раёна. Тым больш што гэты храм быў пабудаваны ў памяць аб салдатах і афіцэрах Гродзенскага гарнізона, што загінулі ў руска-японскую вайну 1904-1905 гадоў, і ў свой час выконваў функцыі гарнізоннай царквы.

**«Сёлета 52-му спецыялізаванаму батальёну Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь споўнілася 15 гадоў з дня заснавання. За гэты перыяд праведзена пошукавая праца на тэрыторыі 111 раёнаў ва ўсіх абласцях Беларусі (1671 аб'ект). Абазначаныя межы пахаванняў 317950 загінулых у гады Першай і Другой сусветных войнаў, а таксама вайны 1812 года. У выніку палявых пошукавых экспедыцый і працы ў архівах устаноўлена 1745 імёнаў загінулых, выяўлена і абясшкоджана 3232 выбухованебяспечныя прадметы, знойдзена стралковай зброі — 133 адзінкі, тэхнікі і яе фрагментаў — 156, медальёнаў — 219, жэтонаў — 3646, узнагародаў — 34, іншых прадметаў і рэліквій — 4487.**

**Толькі летась у ходзе палявой пошукай працы эксгуміравалі і перадалі для перапахавання мясцовым органам улады астанкі 4080 загінулых, устанавілі імёны 613 ваеннаслужачых і ахвяраў войнаў.**

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.**

## «ЛЕТНЯЯ АКАДЭМІЯ» ДЛЯ ПАДЛЕТКАЎ БРЭСТА

**Аддзел культуры Брэсцкага гарвыканкама гэтым летам падрыхтаваў унікальны праект для падлеткаў.**

Не ўсе бацькі могуць накіраваць сваіх дзяцей у лагеры адпачынку, вывезці да цёплага мора або пакінуць у вёсцы ў бабулі. Менавіта для такіх падлеткаў і арганізаваная «Летняя Акадэмія адпачынку», дзе кожны зможа знайсці сабе справу па душы і правесці лета з карысцю, або нават праверыць свае здольнасці ў ролі акцёраў, рэжысёраў, сцэнарыстаў, відэаапаратараў ці дыджэяў. Для ўдзелу ў гэтым праекце ў якасці настаўнікаў сабраныя лепшыя творчыя сілы горада. Гэта акцёры тэатра драмы, філармоніі, вядучыя гарадскія рэжысёры, прадстаўнікі тэлебачання і высакакласныя харэографы.

Праўда, колькасць удзельнікаў у гэтым праекце, на жаль, абмежаваная. Што ўсё ж не павінна быць падставай для суму: падобную «Летнюю Акадэмію» плануецца арганізоўваць штолета.

**Ян ПАЛЕСКІ.**

## ЛІПЕНЬСКУЮ КАЗКУ ГЛЯДЗЯЦЬ У ЖНІЎНІ

**Яе прыдумала маладая мастачка Вольга Іванова. Але пры дапамозе старой гарадской архітэктуры Мінска і Варшавы. Напэўна, яна аматарка праводзіць лета ў горадзе. Бо яе мастацкая казка натхнёная горадам і складаецца адразу з 23 сюжэтаў, кожны з якіх з'яўляецца асобным творам.**

Гэтыя творы будуць экспанавацца ўвесь жнівень па буднях — да 1 верасня — у сталічным кінатэатры «Мір». Можна лічыць, што гэта летняя справаздача маладой мастачкі. Бо выпускніца вучэльні імя Глебава Вольга Іванова ўжо мае шэраг творчых дасягненняў.

Тое, што яна любіць вандраваць, можна зразумець і па яе творах. Бо на іх дзіўныя вуліцы гарадоў, па якіх можна шпацыраваць у думках, людзі і жывёлы, якія жывуць у дамах. Пейзажы, партрэты і нават нацюрморты, якія прыкмеціў позірк дзяўчыны, перайшлі на карціны дзякуючы змяшанай тэхніцы, якую выкарыстоўвае мастачка.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.
Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292-44-12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

Рэверс з сеціва

## ШКОЛА І МАГІЧНАЕ КОЛА

*(24 ліпеня 2010 года)*

**Нас вучаць у школах толькі добраму: заўсёды дапамагаць людзям. Аднак больш чым 50-гадовая гісторыя агульнаадукацыйнай школы вёскі Княгінін Мядзельскага раёна наводзіць на роздум, нібыта нейкія сілы даўно рыхтаваліся працу звычайнай школы паралізаваць, а больш чым 80 дзяцей рассыпаць па іншых вёсках і навучыць не верыць у лепшае...**
**<u>Бацькі беларускамоўных школьнікаў вёскі Княгінін адстойваюць права навучання ў сваім аграгарадку.</u>**

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

@

Журналістка малайчына! Сп. Цімошык дапамагла адстаяць ЦЭЛУЮ БЕЛАРУСКУЮ ШКОЛУ!

**Чытач.**

@

Вось прыклад не толькі таленавітай, але яшчэ і эфектыўнай журналісцкай працы.

Каб газета не звярнула ўвагу на закрыцце школы — усе было б шыта-крыта. А цяпер гэтыя чыноўнікі сто разоў падумаюць, перш чым пазбаўляць людзей беларускай школы.

**Уладзя.**

@

Варта спадзявацца, што ад школы адчэпяцца і пакінуць беларускую навучальную ўстанову ў спакоі! Трэба, каб «Звязда» працягвала кантраляваць сітуацыю.

**Наталля Зуёнак.**

@

Даўно хацелі закрыць. Таму нічога не рабілі. Усе ведалі, чыноўнікі адкрытым тэкстам казалі, што расфарміруюць. А цяпер — не, няпраўда, параіцца хацелі. Хоць бы прызналі шчыра. З тым рамонтам колькі праверак было, але ўсе скончыліся тым, што пазамянялі людзей у аддзеле адукацыі, і усё. Вось і рамонт.

**Ананім.**

@

Малайцы людзі, што адбілі сваю школу! Выходзіць, грамадой можна змяніць многія сітуацыі ў нашым жыцці. А былі б памяркоўныя і цярплівыя, чыноўнікі зрабілі б так, як ім хочацца! Свае правы трэба адстойваць!

**Чалавек.**

@

1. Дзіўныя сумы называе чыноўніца. Наколькі вядома, фігуравалі зусім іншыя лічбы. Называлі раней больш за 400 тысяч па лініі аграгарадка. А тут амаль у два разы менш. Дзе ж астатняе?

2. Калі закрылася фірма, якая рабіла рамонт, то, напэўна, дзесьці ёсць яе былы гаспадар, з якога адказнасць немагчыма зняць. Ці чыноўнік, які курыраваў гэты рамонт і бачыў, як і што зроблена. Аднак ён стаў дырэктарам адной з мядзельскіх школ. Гэта павышэнне за запланаваны развал? Чаму ніхто так і не адказаў за работу?

3. Калі страха цячэ даўно, то чаму яе не перарабліваюць летам, калі канікулы?

4. Калі дырэктар ездзіць і пабіраецца наконт мэблі — значыць, камусьці на яе выдаткоўваюць грошы. Цікава па якім прынцыпе выбіраюць?

5. Калі школа зачынена МНС, то чаму аддзел адукацыі сам не б'е трывогу? Часу засталося мала да новага навучальнага года.

**Не чыноўнік.**

@

Я свайго б у такую школу не пусціла, здароўе дзіцяці важнейшае. А калі ў іх такі прыгожы сельсавет, то наняла б настаўніка і пайшла б займацца туды, не пасмелі б выгнаць. Уявіце, калі б так усе. Хутка школу пабудавалі б...

**Мама.**

@

Я ў гэтай школе правучылася адзінаццаць гадоў. І на маё здароўе гэта адмоўна не паўплывала. А школа была, ёсць і будзе працаваць. Нягледзячы на ўсялякіх там... і ім падобных. Княгінінцы сваё возьмуць, дзякуючы сваёй упартасці і падтрымцы «Звязды». :)

**Mr. Nikto.**

@

Забаўны выпадак, мяркую, што ў Беларусі ён не адзінкавы. Але Наталля Зуёнак правільна напісала, што калі гэтую справу выпусціць з-пад кантролю, то школу ўсё роўна закрыюць, ціхенька так, без шуму, без пылу. Але журналістка малайчына, адразу за рогі ўзяла РАНА. Рэспект))))).

Шкада, што журналісцкі штат у газеце невялікі, іх бы разаслаць па ўсіх раённых аддзелах адукацыі. Вось шухеру было б)))))).

... іх трэба, шкада, што няма каму))))).

**Назіральнік.**

@

Яшчэ б паказалі лазню і кіназалу ў Доме культуры, вось тады б стала зразумела, што за аграгарадок. Пра людзей не думалі, але сабе сельскі Савет зрабілі пад еўрарамонт. Лепш бы гэтыя грошы дзецям аддалі.

**Бывалы.**

<u>Рэпетытар Яўген ЛІВЯНТ:</u>

## ЧАМУ ВУЧАНЬ АТРЫМЛІВАЕ НА ІСПЫЦЕ Ў ШКОЛЕ 8—9 БАЛАЎ З 10, А ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ НА ТЭСЦЕ — 12—15 БАЛАЎ СА 100?..

*(31 ліпеня 2010 года)*

**Яўген Барысавіч ЛІВЯНТ — аўтарытэтны рэпетытар, які легальна працуе з 2001 года, выкладчык матэматыкі і фізікі, рыхтуе штогод каля сотні вучняў. Да таго ж ён — тэлезорка: некалькі разоў яго запрашалі ў якасці эксперта на тэлешоу «Выбар». На размову са спадаром Яўгенам натхнілі вынікі цэнтралізаванага тэставання па фізіцы (73 % абітурыентаў атрымалі менш за 20 балаў) і матэматыцы (62,5 % абітурыентаў атрымалі менш за 20 балаў). Катастрофа школьнай адукацыі? Дрэннае выкладанне? Дрэнныя вучні? І гэта, і не толькі гэта, мяркуе Яўген ЛІВЯНТ.**

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**

@

Як ні сумна, але ўсё правільна напісана.

**Андрэй.**

@

Падпісваюся пад кожным словам!!! Гісторыя ад мяне. У нашу гімназію прыйшла ве-ельмі вялікая праверка — для акрэдытацыі гімназіі. Паўгода школу трэсла — афармлялі і пераафармлялі дакументы... Шмат усяго было за час праверкі. Напрыклад, школьная сталовая штодзённа зачынялася ў самы наведвальны час для таго, каб пакарміць камісію. Дзеці і настаўнікі заставаліся галоднымі, але гэта нікога не бянтэжыла. Але больш за ўсё мяне ўзрушыла выступленне правяраючай у канцы. Галоўная заўвага — вельмі высокія патрабаванні, бо дзеці напісалі кантрольныя аж на некалькі дзясятых бала вышэй, чым у іх адзнакі за чвэрць! Жах! І як апафеоз маразма: няправільна мы падпісваем сшыткі. У інструкцыі сказана 5 «А» клас, а мы пішам «А». А на нашы аргументы, што двукоссе ў рускай мове пішацца менавіта так, мы атрымалі: «А хто сказаў, што гэта двукоссе?! Гэта проста сімвал...» Вось тут я ўжо не ведаю, што сказаць...

**Настаўнік.**

@

Захоплены артыкулам!!! Усё напісана правільна!

**Учитель.**

@

Калі мая дачка прыйшла працаваць у школу, я зразумеў, якую вялікую памылку зрабіў, калі дазволіў ёй паступаць у пед! Мала таго, што куча ўсемагчымых канцтавараў з майго прадпрыемства перабралася ў школу, мала таго, што мы ўсёй сям'ёй цягалі і рамантавалі парты, рабілі бясконцыя рамонты, трацілі кучу грошай на набыццё недастаючых канцтавараў, аплату газеты, якую выкідвалі, не заносячы дадому, ды яшчэ і вымушаны пастаянна слухаць пра тую бязглуздзіцу, якая робіцца ў школе! Бясконцыя справаздачы, паходы на якісьці футбол-хакей... а колькі разоў яна прыходзіла дадому ў слязах з-за незаслужаных абразаў і крыўдаў! У мяне адчуванне, што я проста губляю сваю дачку. Час прымяніць сваю бацькоўскую волю — і выцягнуць яе з гэтага балота! Дапамагу ёй уладкавацца куды заўгодна, абы падалей ад школы! І хто скажа, што я не маю рацыю?!

**Бацька.**

@

85—90 % дзяўчат, якія закончылі школу (ці заканчваюць), не могуць палічыць кошт 1 літра вады пры цане кубаметра ў 1800 рублёў. Сам быў у шоку. А наконт бюракратыі — то нічога асаблівага...

**Андрэй.**

@

Усё вельмі дакладна падмечана. Цалкам згодна з Яўгенам.

**Алена.**

@

Сістэма тэставання працуе добра?

Можа, яно і так, але што да матэматыкі, яна вядзе да катастрафічнага падзення узроўню не то што ведаў, а ўвогуле матэматычнага, а значыць, і інтэлектуальнага развіцця школьнікаў. Гэта добра давёў выдатны расійскі матэматык і педагог І.Ф. Шарыгін... Але да выбітных матэматыкаў у нас не надта і прыслухоўваюцца. Таму сістэма тэставання, відаць, яшчэ застанецца надоўга. А значыць, сітуацыя можа пагаршацца і надалей. Хоць падзенне можна запаволіць удасканальваннем сістэмы не толькі тэставання, але і ўсёй адукацыі. Найперш тут патрабуецца галоснасць, празрыстасць, дэмакратызм, узаемапавага.

Вельмі важны чыннік — змест саміх тэстаў. Што там хто не казаў пра стандарты матэматычнай адукацыі, як бы іх не закладвалі ў навучальныя праграмы, рэальна дзейныя стандарты фарміруюць змест тэстаў ЦТ. Бо ў нас як? Калі, скажам, няма ў тэстах задач з параметрамі, то і на ўроках іх не будзе, бо настаўнік працуе на канчатковы вынік — гэткая ўжо заганная сістэма склалася. Між тым, задачы з параметрамі прысутнічаюць у школьных падручніках. Бо іх аўтары разумеюць значэнне падобных задач для матэматычнага развіцця школьнікаў. Не трэба ў тэстах праводзіць разгорнутыя доказныя абгрунтаванні, дык і на ўроках ім не надаецца пільнай увагі. Страчваецца сама сутнасць матэматыкі, якая фармуе не толькі інтэлектуальны, але і маральны прынцып — патрэба ў доказе ісціны. Накіраванне школьніка на канчатковы вынік — атрыманне адказу, не істотна, якімі спосабамі атрыманаму, — вядзе да згубы сутнасці самой матэматыкі ў навучальным працэсе.

Пра хібы сістэмы тэставання ў нас амаль ніколі не пішацца, хоць дзесьці там у вузкім асяродку пра іх гаворыцца. На суд грамадскасці, нават саміх настаўнікаў, гэта не выносіцца. Гэта як разумець? Закрытасць, адсутнасць галоснасці, дыскусій, непавага да настаўнікаў з боку чыноўніцтва — яшчэ адзін чыннік, што прывёў адукацыю да сістэмнага крызісу. Чаму б тут не павучыцца ў суседзяў?

Возьмем Расію. Там ёсць рух наперад. З тэстаў выкінулі частку А, дзе былі заданні з адказамі. Ёсць часткі В — 12 заданняў і частка С — 6 задач, якія трэба запісваць з поўнымі рашэннямі. Сярод іх, вядома ж, і задачы з параметрамі, якія давялі сваю значнасць цягам многіх гадоў экзаменацыйнай практыкі.

На пачатку навучальнага года расійскім школьнікам прапануецца дэма-версія тэста, які задае фармат тэста, што трэба будзе здаваць у канцы года на АГЭ. Цягам года прапануецца 10 дыягнастычных прац-тэстаў, трэніровачныя тэсты, рабочыя сшыткі з прыкладамі і рашэннямі асобных заданняў і шматлікая літаратура. Прычым усё гэта агульнадаступна і змяшчаецца на афіцыйным сайце АГЭ. У грамадстве, у прадметных часопісах, на інтэрнэт-форумах ідуць шматлікія дыскусіі па праблемах АГЭ. Школьнікі на інтэрнэт-форумах жыва абмяркоўваюць, нарэшваюць задачы з усіх гэтых матэрыялаў. Ёсць і там праблемы, але адчуваецца жыццё, нейкі рух.

А ў нас? Тры рэпетыцыйныя тэставанні, умовы заданняў якіх вучням не аддаюцца. Літаратура выдаецца, але сістэмнай дзяржаўнай палітыкі пры гэтым не адчуваецца. Выдаюцца зборнікі тэстаў ЦТ па гадах, але без рашэнняў. Школьнікам цікава было б пабачыць узоры разважанняў. Грунтоўнай статыстыкі па ЦТ, якая была б важная для вучняў і настаўнікаў, няма. Чаму б не надрукаваць разбалоўку па кожным заданні? У адукацыйнай інтэрнэт-прасторы — цішыня, цяжка ўявіць — няма ніводнага настаўніцкага форума! Праўда, адзін стыхійна ўзнік у газеце «Звязда». У ведамасным выданні ўвогуле адсутнічае сайт (пішуць — у распрацоўцы). Сёння газета без сайта, без магчымасці ўступіць у зацікаўлены дыялог з аўтарам, каб спраўдзіць ісціну, паспрачацца, — гэта не газета ці газета з «каменнага веку». На сайце РІКВ на крытычныя заўвагі і пытанні настаўнікаў не адказваюць. Там нельга спампаваць ніводнага тэста мінулых гадоў. Прапануюць кампакт-дыскі, але, прабачце, дзе іх купіць школьнік з глыбінкі?

Праблем шмат. Іх не зменшыцца ў выніку павышэння заробку настаўнікаў на 100 руб. Патрэбны радыкальныя меры па ўсіх напрамках.

**Іван Сяргеевіч.**

@

Яўген, дзякуй за вашу грамадзянскую пазіцыю — за смеласць і заклапочанасць будучыняй нашай краіны.

**Таварыш.**

@

1. Тэставанню — празрыстасць і адкрытасць. Вучню неабходна даць права ведаць, за што і як.

2. Абітурыенту — права выбару пацвярджэння сваіх ведаў: тэставанне, тэставанне ў ВНУ, вусны экзамен. Людзі розныя.

3. Настаўніку — вялікі дзякуй і нізкі паклон за альтруізм, за нізкую зарплату, на наяўнасць сумлення!!!...

4. Чыноўніку — а Вы паспрабуйце самі папрацаваць у школе, павыконвайце свае інструкцыі, пазапаўняйце журналы, пакажыце, як трэба! Спусціцеся на зямлю.

5. Бацькам — галоўнае спакой, здароўе не купіш.

6. Рэпетытару — быць творчым проста неабходна.

**Уладзімір.**

**(працяг тэмы - на стар. 7)**

## ФІЛАСОФІЯ МОВЫ

*(31 ліпеня 2010 года)*

**Раней я не задумвалася пра гэта. Падыходзіла да гэтага неяк па-падлеткаваму наіўна. Але вось падумалася: я размаўляю і пішу на амаль-што-мёртвай-мове. Я спалохалася гэтай высновы. Я падумала: гэта абсурд. Бессэнсоўна. Па-дурацку. Глупства. Я падумала: як жа я так жыву, размаўляючы на мове, якой амаль-што-няма?! І чаму некаторыя людзі размаўляюць па-беларуску толькі ў беларускамоўных кампаніях, а не заўжды ў жыцці?.. І што гэта значыць, калі па-беларуску «гавораць» непрыемным голасам з няправільным вымаўленнем гучнагаварыльнікі ў метро і нешматлікія шыльды шматлікіх крамаў?.. Гэта спосаб стварыць беларускай мове імідж нягеглай і непрыемнай прадстаўніцы лінгвістычнага свету?.. Здаецца, найбольш па-беларуску называюць аптэкі. Відаць, таму, што ад рускага адпаведніка беларускае слова адрозніваецца толькі адна літара: і «непісьменным» беларусам так «панятней», і другую дзяржаўную мову нібыта не забылі...**

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

@

Беларуская літаратурная мова і сапраўды — калі чыстую праўду казаць — аджытак, які дзве малюпасенькія купкі сяброў і іх блатных сябручкоў пісьменніцкіх саюзаў спрабуюць ўратаваць, але не дзеля прапаганды і агітацыі, а для... сябе. Мова — іх карміцелька. Амбіцыёзная, маральная, а для «партыйных пісьменнікаў» яшчэ і матэрыяльная. Узгадаем усіх нашых «засужана-народных», уключаючы Мележа і самога Быкава, іх апалагетаў. Чаму б ім было не пець, чаму не брыкацца, не паказваць нораў? Сучасныя — многа хітрэйшыя. Многія з іх таксама займаюць кіруючыя пасады (напрыклад, рэдагуюць чорт ведама што, уключаючы... раёнкі, якія на 300 працэнтаў скарыстоўваюць і для самадрукавання ўласных негаручых рукапісаў. Вось толькі няма каму іх опусы чытаць! Не стала Саюза — не стала і 300-500-тысячных тыражоў. Беларускамоўныя творы не прымае на творчыя конкурсы нават шматнацыянальная Расія, а перакладчыкаў-профі не густа, дакладней, няма попыту на творчасць нашых класікаў і клясікаў.

**Сцяпан Месяц.**

@

Так-так. Але ці не крыўдна тое, што мова стала проста нейкай цацкай у руках розных палітычных структур і суполак! Калі ты размаўляеш па-беларуску, то тут абавязкова трэба палітыку ўблытваць! Навошта? Мова — гэта складнік культуры ў першую чаргу. І трэба разумець, што мова — гэта наша нацыянальная адметнасць, якую мы ў большасці сваёй не паважаем і не шануем. А дарэмна! Хто ж нас тады паважаць будзе, калі мы самі сябе не паважаем!!! Вунь калі ВІА ГРА ў Мінск прыязджала, дык сказала: беларуская мова такая смешная. Вы ўявіце, калі б такое ва Украіне сказалі ці, наогул, у любой іншай краіне свету: у Польшчы, Літве, Чэхіі... Што б там пачалося!!! А мы талерантныя і добрыя, нам усё роўна, мы ўсім усё прабачаем...

**Дзяўчо.**



# ФАТАГРАФІЧНЫ АЛІМП. КАМУ ПАКЛАНЯЦЦА?

Купляй лепшае!



**Canon ці Nikon? Люстраны ці «мыльніца», а можа ўвогуле стужкавы? Між мегапікселямі ды zoom-ам, максімальным дазволам ды адчувальнасцю фотаплязкі... Усё пытанні, пытанні, пытанні... Вехі вагаюцца то ў адзін, то ў другі бок. Дык давайце ж разбяромся ў гэтым: чаму ўрэшце аддаваць перавагу, а ад чаго прыйдзецца адмовіцца!**

Нядаўна я натыкнуўся на адзін цікавы артыкул. Досыць прыемна было чытаць пра такія знаёмыя кожнаму з аматараў фатаграфавання з'явы, як выкідванне лічбавага кіча на якіясьці сайты. Крыху нагадаю: існуе шмат інтэрнэт-старонак, на якіх карыстальнікам прапануецца змяшчаць свае ўласныя здымкі; некаторыя з іх нават прэтэндуюць на прафесійнасць — у тым сэнсе, што вам ставяць адзнакі і пакідаюць каментары іншыя карыстальнікі, так бы мовіць, прафесіяналы. Майстэрствам, вядома ж, пахне тут замала, бо, як паказвае практыка, вы атрымоўваеце ад кагосьці бал, а ва ўдзячнасць самі ставіце яму тое самае, але з выразам «Thank you!!».

Дык што ж такое «Г-графія»? Аўтар таго артыкула кажа, што гэта такі тып фотамастацтва, калі вы робіце здымак зыходзячы з прынцыпу «пабачыў, дастаў мыльніцу, сфоткаў». А як жа кампазіцыя, сюжэт... мастацтва ўрэшце? А нашто: вы ж проста г-граф, і кропка!

А як жа нам не трапіць у такі клас фотамастакоў? Няўжо патрэбна набываць прафесійную тэхніку за не адну тысячу доляраў? Здаецца, што не, бо сапраўдныя майстры змогуць іграць мелодыю і на дзвюх струнах. Так, напрыклад, аўтар досыць вядомага сайта «Глобус Беларусі» робіць усе свае здымкі звычайным Canon PowerShot A230.

З чаго ж нам тады зыходзіць пры выбары апарата? Тут трэба абапірацца на тое, якія мэты вы ставіце перад сабой. Як кажа ўсё той жа Андрэй Дыбоўскі, «галоўнае — не чым ты здымаеш, а — як»!

### Я і бутэлька «Крыніцы»

Калі вы робіце здымкі без усялякіх прэтэнзій на прафесійнасць (у тым сэнсе, што вы не імкняцеся зарабляць гэтым грошы, ці перамагаць у фотаконкурсах), але хочаце нават з фоткі кола сяброў зрабіць сапраўднае мастацкае палатно, тады вам трэба памятаць усяго толькі некалькі простых рэчаў.

Першае — гэта кампазіцыя. Не буду паглыбляцца ў дакладны разгляд гэтага прыёму, скажу толькі, што гэта не вельмі добры пошук правільнага размяшчэння аб'ектаў у кадры. Найбольш звыклая памылка фатографаў-пачаткоўцаў у расстаноўцы аб'екта (напрыклад, хакейнага варатара) у цэнтры, пасярод астатняй няважнай пустэчы. Найбольш прывабна здымак будзе выглядаць, калі вы ўмоўна нейкімі рэчамі падзеліце яго на тры часткі (напрыклад, 2/3 лес — 1/3 неба). Можна карыстацца рознымі лініямі, якія ствараюць нейкую агульную арнаментуру...

Другое — гэта сюжэт. Паспрабуйце прыцягнуць увагу гледача на тое, што вы хацелі паказаць. Напрыклад, вы стаіце з бутэлькай «Крыніцы» ў руцэ — што тут галоўнае: ці ваша весялосць, ці нейкая неардынарнасць надпісаў на бутэльцы, ці мо сэнс у тым, што без піва жыццё немагчымае? У першым варыянце галоўнае — вашы вочы і ўсмешка (увогуле ў партрэтыстыцы цэнтральнае месца займаюць вочы); у другім — сама «Крыніца»; у трэцім — чалавек у шыкоўным касцюме, які п'е сок, знаходзячыся ў асяродку «піўва і галечы».

Трэцяе — гэта сам фотаапарат. Як нагадвае спадар Дыбоўскі, гэта зусім не важна... амаль што! Пэўныя характарыстыкі ўсё ж павінны прысутнічаць. Так, пажадана, каб максімальны дазвол быў не менш за 1024*768 пікселяў ды прысутнічала магчымасць уласнай настройкі. Калі выбіраць, дык перавагу аддамо мадэлям з меншым дысплеем ды больш тоўстым вонкавым выглядам: павінна ж там штосьці ўнутры быць!

### Матрыца: люстэрка

Безумоўна, люстраны фотаапарат — гэта шыкоўна! Дзякуючы сістэме люстэрак, мы маем неперакрыўленую матрыцу лічбаў. А гэта, у сваю чаргу, забяспечвае цудоўную карцінку. Безумоўна, усё гэта каштуе нашмат больш за любую, нават амаль ідэальную паўпрафесіяналку, кшталту Canon S3. Паміж імі сапраўдны «вялікі каньён». Не столькі, безумоўна, у параметрах, колькі ў кошце. Купляць Люстэрнік варта толькі, калі вы асэнсоўваеце сябе ўжо не проста аматарам, але ўжо нават напаўмайстрам. У іншых выпадках смела бярыце годную semi-profi.

Пра іх і пагаворым... Калі вы ўзялі такі апарат, дык, падаецца, павінны адчуваць нейкую адказнасць, перш-наперш, перад сабой: на мой погляд, вы ўжо з'ўляецеся мастаком — як мінімум, у душы. Просты падыход болей не ваш ідэал, такія здымкі вас не задаволяць. Вы шукаеце цудоўных начных і ранішніх шпацыраў, вас вабіць душа чалавека, яго адметнасць (хай нават цялесная)... Менавіта таму не забудзьцеся на штатыў: без гэтай рэчы не будзе вам ані світання, ані інтымных абрысаў...

Пры выбары фотаапарата звярніце ўвагу на некалькі рэчаў: мегапікселі, zoom, макраздыманне ды цягласць акумулятараў. Разбяром па чарзе.

У пагоні за мегапікселямі шмат хто губляе галаву. У той час яны не звяртаюць увагі на каментары спецыялістаў. Апошнія сцвярджаюць, што адрозненне ў якасці з павышэннем колькасці лічбавых кропак падае. А гэта значыць, што пры іх наяўнасці, большай за 8 мільёнаў, розніца, нават пры дзесяціразовым павелічэнні, невялікая.

Надалей Zoom. Скажу шчыра, што не часта карыстаюся гэтай функцыяй, бо непатрэбна было дый слабаваты ён у мяне (толькі 4x). Так, разглядаць тут трэба толькі яго аптычны складнік: надалей ідзе павелічэнне за кошт якасці. Калі вы фотажурналіст, дык абавязкова бярыце па-максімуму (а лепш потым спецыяльны аб'ектыў набыць); калі ж не, дык вам і такога, як у мяне, «задужа» будзе: zoom карысны толькі ў выпадку немагчымасці набліжэння да аб'екта фатаграфавання!

Колькі слоў пра іншыя аспекты. Макраздыманне, на лепшы выпадак, павінна быць такім, каб можна было выдатна сфатаграфаваць муху, якая месціцца на аб'ектыве. Што датычыцца акумулятараў, дык зыходзьце з таго, што фатаграфаваць вам давядзецца і ў мароз, і з выкарыстаннем набліжэння, што зашмат «з'ядае» энергіі, ды, паколькі вы мастак, дык рабіць свой адзіны шэдэўр будзеце не адну гадзіну. Таму, чым больш, тым лепш! І яшчэ: з уласнай практыкі скажу, што лепш, каб былі звычайныя «пальчыкавыя» акумулятары класа AA ды AAA — лягчэй насіць ды, у форс-мажорных абставінах, набыць у краме замену.

### Архаізм кожным рухам

Гэта бог усёй фотатэхнічнай сям'і, гэта СТУЖКАВЫ фотаапарат! Гэта не тэхніка, а цуд: спалучэнне якасці... і ненадзейнасці, подыху гісторыі... і дарагавізны. Адзін з іх займае ганаровае месца на своеасаблівым Алімпе, гэта таварыш Zenit...

Як бярэш гэтую калдобіну ў рукі, адразу адчуваеш сябе творцам, датыкаешся да пылу гісторыі — атрымоўваеш розум продкаў! І ўсё гэта не толькі з-за таго, што цяпер якасць здымка, рэзкасць залежаць толькі ад вас (цяпер анічога машына за вас не зробіць), але да гэтага маюць дачыненне... і грошы. Так, насамрэч, калі за кожныя 36 кадраў плаціш як мінімум 9 тыс. рублёў, дык цяпер проста так пстрыкаць не будзеш — падыход да выбару кампазіцыі, сюжэта зробіцца больш дэталёвым. Як след лепшыя здымкі... праўда, з тых 36 кадраў звычайна атрымоўваюцца 1-2 годныя.

Безумоўна, ёсць і адваротны бок медаля. Так я на пачатку карыстання Zenit-ам сапсаваў амаль усе кадры, якія так старанна падрыхтоўваў: першым разам я не ведаў, як вымаць стужку як след — амаль усю засвяціў; другім разам зноў няправільна вымаў — парваў стужку на дзве часцінкі (як жартаваў мой сябра, яна мне паддалася); потым няправільна (ды, хутчэй, увогуле ніяк) выстаўляў дыяфрагму — усё змазанае...

Ёсць і пэўныя перашкоды на шляху да адлічбоўкі негатываў (дарэчы, калі не казаў, за невялікую даплату можна адразу перавесці негатывы ў лічбавы варыянт, які вам запішуць на дыск). Гэта, скажам так, выпадковасці: калі вам прыносяць негатывы і кажуць, што вы засвяцілі ўсе кадры, ці ўвогуле прынеслі пустую стужку... Але гэта толькі і надае пэўнага рамантызму!

Такім чынам, робім выснову: не важна якая ў вас тэхніка ў руках: ці то Canon, ці то Nikon — не важна, колькі ў вас мегапікселяў ці якая адчувальнасць — галоўнае, каб вы атрымоўвалі сапраўдную асалоду ад таго, што робіце, ды, вядома, ад вынікаў.

**Мікола ТАМАШЭВІЧ.**

Краіна здароўя
Выпуск № 36 (205)



Прамая лінія

# ЯЗВА АДСТУПІЛА. НАСТУПІЛА ПЯКОТКА



**На пытанні чытачоў адказалі дацэнт 2-й кафедры ўнутраных хваробаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Мікалай КАПРАЛАЎ і дацэнт гэтай жа кафедры, кандыдат медыцынскіх навук Ірына ШАЛАМІЦКАЯ.**



**(Працяг. Пачатак у нумарах за 29—31 ліпеня, 3 жніўня.)**

***☎ — Віцебская вобласць, Аліна. У сястры летась знайшлі паліп кішэчніка. Звярнуцца да практолага яе прымусіла пастаяннае расстройства страўніка. Паліп ужо выдалілі. Аднак хацелася б даведацца, з-за чаго з'яўляюцца паліпы? Ці могуць яны ўзнікаць паўторна? Якім чынам не дапусціць новых паліпаў?***

— Паліп, як правіла, абумоўлены генетычна. Гэта дабраякаснае разрастанне тканак. Паліпы бываюць розных відаў, формаў, часам нагадваюць грыб на ножцы. Могуць забяспечвацца крывёю праз сасуд. Небяспечны паліп тым, што можа пераходзіць у злаякаснае ўтварэнне. Таму такая сітуацыя лічыцца передракавай. Тактыка лячэння практолагаў, эндаскапістаў — як мага больш ранняе выдаленне з абавязковым гісталагічным даследаваннем. Паталогія досыць распаўсюджаная для страўнікава-кішачнага тракта. Выдаленне паліпа праводзіцца эндаскапічным метадам. Для папярэджання развіцця паліпа не існуе ніякіх медыкаментозных метадаў. Пасля выдалення паліпа чалавек павінен весці здаровы лад жыцця і перыядычна, раз на год, праходзіць даследаванне слізістай абалонкі страўнікава-кішачнага тракта.

***☎ — Бабруйск, Алена Канстанцінаўна. Што маецца на ўвазе, калі гавораць пра ачышчэнне печані? Ці можна прымаць прэпараты для падтрымання печані самастойна? Калі так, то якія менавіта?***

— Пацыенты нярэдка пытаюцца пра неабходнасць чысткі печані. Але печань — гэта не пінжак, які аднойчы можна пачысціць шчоткай, а потым зноў забруджваць. Тэрмін чысткі тут не да месца. Печань не трэба пашкоджваць, а непашкоджаную печань не трэба ні чысціць, ні абараняць.

Наогул мы гаворым пра ўнікальны орган, самы буйны орган унутранай сакрэцыі. Ролю гэтага органа цяжка пераацаніць. Функцыі сэрца, лёгкіх, нырак нельга параўнаць з функцыяй печані. Вораг нумар адзін для нашай печані — гэта алкаголь. Большасць пашкоджанняў гэтага органа звязана менавіта з алкаголем. На другім месцы па частаце пашкоджанняў выступаюць вірусы гепатытаў — A, B, C, D, E, F, G. Найбольш распаўсюджаныя першыя чатыры тыпы. Вірус A перадаецца праз нямытую гародніну — пераральна. Вірусы B, C, D перадаюцца парантэральным шляхам — праз кроў, а значыць, ін'екцыйным шляхам, ад маці дзіцяці і сэксуальным шляхам. Асабліва каварны гепатыт C, які ў 20 працэнтах выпадкаў фарміруе цыроз печані.

Калі печань не пашкоджана, чалавек трымаецца здаровага ладу жыцця, то не трэба абараняць печань. Хоць зараз існуе досыць вялікая група раслінных прэпаратаў, якія мы шырока выкарыстоўваем пасля перанесеных гепатозаў, гепатытаў, звязаных і не звязаных з алкагольнай залежнасцю, у хворых, якія пакутуюць ад атлусцення, цукровага дыябету. Прымяняюцца такія прэпараты, як агастацын на аснове растаропшы, карсіл, ліў-52. Гэта гепататропныя прэпараты, якія паляпшаюць метабалічныя працэсы ў печані і шырока выкарыстоўваюцца пры рэабілітацыі згаданых хворых.

***— А якія паказчыкі крыві сведчаць аб праблемах з печанню?***

— Вельмі важнае пытанне. Чамусьці ў нашых грамадзян склалася ўражанне, што галоўны метад дыягностыкі печані — ультрагукавы. Гэта абсалютна не так. Такі метад прымяняецца, але ён не на першым этапе дазваляе дыягнаставаць сур'ёзную паталогію печані. Ёсць так званыя лабараторныя тэсты, якія дазваляюць на першым этапе дыягностыкі атабраць групу хворых, у якіх верагоднае пашкоджанне печані. Вянозная кроў даследуецца на білірубін і такія адчувальныя да запаленчых працэсаў у печані ферменты, як АЛТ, АСТ, гамма-ГТП, ЛДГ.

***☎ — Маладзечна, Віялета. Алергія праяўляецца ацёкам верхніх дыхальных шляхоў. Аднак ці можа такі стан быць вынікам запалення падстраўнікавай залозы — панкрэатыту, выяўленага падчас ультрагукавога даследавання? Ці можна прымаць лекі ад алергіі пры хворай падстраўнікавай?***

— Даць дакладны адказ на ваша пытанне можна толькі пасля поўнага збору анамнезу — гісторыі развіцця алергічных прыступаў. Больш верагодна сітуацыя, пры якой развіццё алергіі звязана з харчовым прадуктам. Харчовая алергія знаходзіць цяпер вельмі шырокае распаўсюджанне ў свеце, прычым мы прывыклі, што высокаалергеннымі з'яўляюцца клубніцы, цытрусавыя, яйкі. Сёння да гэтых харчовых прадуктаў варта аднесці і натуральнае малако, якое можа фарміраваць харчовую алергію. Акрамя харчовых прадуктаў, развіццё алергіі можа быць звязана з уздзеяннем іншых алергенаў — поўсцю жывёл, пылком раслін і інш. Нярэдка вызначыць прычыну алергіі надзвычай складана...

Вам неабходна пракансультавацца ў тэрапеўта ці алерголага, які ўстановіць, з чым звязана праблема алергіі. Можа быць, тыя лекавыя прэпараты, якія вы прымаеце ад панкрэатыту, і фарміруюць алергічную рэакцыю. Адваротная ж сітуацыя практычна не рэальная. Трэба таксама вызначыць прычыну вашага панкрэатыту — пашукаць камяні ў жоўцевым пузыры. Жоўцева-каменная хвароба таксама можа быць звязана з развіццём алергіі. Больш за тое, жоўцева-каменная хвароба і запаленне жоўцевага пузыра пашкоджвае і печань. Таму трэба абследавацца, разабрацца з усім ланцужком па парадку.

***☎ — Мінск, Вольга Аляксандраўна. У паліклініцы сказалі, што адзін «плюс» хелікабактара лячыць не трэба, а ў камерцыйным медцэнтры сказалі, што трэба і выпісалі антыбіётыкі. Хто мае рацыю?***

— Адзін «плюс» азначае, што ў слізістай жыве хелікабактар пілары — Нр, але ступень абсемянення невысокая. Вывучаючы біяптат слізістай абалонкі страўніка, урач-марфолаг убачыў толькі 20 мікробных цельцаў. Убачыў бы ад 20 да 50 мікробных цельцаў, паставіў бы два «плюсы», звыш 50 — тры «плюсы». Мінімальная і максімальная ступені абсемянення лечацца абсалютна аднолькава. І там, і тут ёсць інфіцыраванне, таму прымяняецца стандартная схема лячэння. Так што рацыю мае ўрач платнай клінікі.

***— Калі ў аднаго з членаў сям'і ёсць «плюсы», ці азначае гэта, што праблема датычыцца і блізкіх?***

— Шанц заразіцца ў блізкіх ёсць. Заражэнне можа адбыцца праз агульны посуд, ручнік, паколькі шлях заражэння — праз рот. Таму ўнутрысямейная інвазія вельмі верагодная. Калі нехта з членаў сям'і, дзе ёсць інфіцыраваны Нр, скардзіцца на непрыемныя сімптомы — дыскамфорт у эпігастрыі, пякотку, то ён павінен прайсці даследаванне на наяўнасць Нр у страўнікава-кішачным тракце. Калі ж скаргаў няма, то, паводле нашых пратаколаў лячэння, даследаваць усіх членаў сям'і не варта. За мяжой не так. Там калі ў аднаго члена сям'і выяўляюць Нр, усім іншым прапануюць прайсці тэставанне. Пры гэтым дыягностыка магчымая і неінвазіўным метадам, з дапамогай дыхальнага тэста. У нас такі метад неінвазіўнай дыягностыкі толькі знаходзіць сваё месца. Вясной гэтага года ўпершыню было набыта такое абсталяванне для РНПЦ «Маці і дзіця». У першую чаргу дыхальныя тэсты выконваюцца дзецям, паколькі інвазіўны метад для іх надзвычай складаны.

***— Вы кажаце, што заражэнне магчымае ў сям'і праз пабытавыя прадметы... Няўжо не дастаткова добра, гарачай вадой, мыць посуд?***

— Тэмпература вады павінна быць звыш 50 градусаў. Мыць посуд трэба дасканала, гарачай вадой, з выкарыстаннем мыйных сродкаў, а яшчэ лепш — карыстацца індывідуальным посудам або пасудамыечнай машынай. Дарэчы, усе пункты грамадскага харчавання павінны прымяняць пасудамыечныя машыны — для больш дасканалай апрацоўкі выкарыстанага посуду. Гэтыя санітарна-гігіенічныя меры дазваляюць папярэдзіць інфіцыраванне хелікабактарам, які з'яўляецца галоўным фактарам развіцця паталогіі верхняга аддзела страўнікава-кішачнага тракта.

**Святлана БАРЫСЕНКА,**
**Вольга ШАЎКО.**
***(Працяг будзе.)***



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Віктар САРАКАЛЕТАЎ (на фота справа) і Андрэй КАРАСЬ — выхаванцы Хойніцкай школы алімпійскага рэзерву, прызёры і пераможцы рэспубліканскіх і еўрапейскіх чэмпіянатаў па цяжкай атлетыцы. Нават у летнія дні маладыя спартсмены наведваюць гэтую гарадскую кузню будучых алімпійцаў, як называюць у Хойніках спартзалу, каб заўсёды заставацца ў добрай фізічнай форме.**

Смачна есці!

# ЗДАРОВЫ КАВУН
## заўсёды іскрыцца крупінкамі

**Надышла пара актыўнага гандлю кавунамі і дынямі. Гэтыя паўднёвыя ласункі заўсёды дарэчы на нашых сталах. Аднак каб атрымаць сапраўдную асалоду ад вялікай ягады, трэба ўмець правільна выбраць самы сакавіты і спелы кавун.**



Нягледзячы на вялікую колькасць народных назіранняў, вызначыць спеласць кавуна няпроста. Спецыялісты сцвярджаюць, што абсалютна дакладных крытэрыяў тут няма. Першае, на што трэба звярнуць увагу, дык гэта на лупіну паласаціка. Яна заўсёды павінна быць насычанага колеру і вельмі шчыльнай. Кавун павінен быць з сухім хвосцікам і выдаваць звонкі гук пры пастукванні А калі вы сцісніце яго дзвюма рукамі — спелы затрашчыць. Адна з істотных прыкмет якасці — жоўты (а не белы) колер земляной пляміны на баку кавуна. Акрамя таго, можна пацерці бок і панюхаць яго. Калі прыбіўся пах свежаскошанай травы, не бярыце тавар. Знаўцы сцвярджаюць: такі водар не павінен ісці ад кавуна. Не павінна быць і рыхлай мякаці і сарцавіны нават у пераспелай ягады. Апошняе можна праверыць толькі разрэзаўшы кавун. Аднак гэтага якраз рабіць нельга.

Прычына ў тым, што на паверхні кавуна знаходзіцца вельмі шмат узбуджальнікаў кішэчных інфекцый, якія пры парушэнні цэласнасці лёгка пранікаюць у мякаць і ствараюць сур'ёзную пагрозу здароўю тых, хто вырашыў паспытаць сакавітую ягаду. Тым больш такія маніпуляцыі небяспечныя, калі няма ўмоў памыць і кавун, і нож, якім яго надразаюць. Вядома, што бахчавыя захоўваюць і перавозяць далёка не ў стэрыльных умовах. Таму санітарнымі нормамі нашай краіны, а таксама правіламі гандлю на рынках, зацверджанымі пастановай Савета Міністраў, забаронена рэалізацыя бахчавых культур у разрэзаным і надрэзаным выглядзе.

Яшчэ кавуны схільныя да назапашвання хімікатаў, якія былі выкарыстаны пры іх вырошчванні. Гаспадары для паскарэння саспявання кавуноў часта шчодра падкормліваюць іх «хімічнымі» вітамінамі, каб сабраць за сезон 2-3 ураджаі. А калі кавун не дацягвае па колеры, яму робяць усяго адзін укол марганцоўкі. Безумоўна, партыі такіх «мутантаў» бракуюць. Але ўсё ж верагоднасць набыць невядомага паласатага гіганта ёсць.

Як жа вызначыць, перакормлены кавун нітратамі ці не? Калі ў разрэзаным выглядзе вы бачыце чырвоную мякаць з лёгкім адценнем ліловага колеру, то гэта «ліпавы» кавун. Пры лішку нітратаў і нітрытаў у мякаці можна знайсці жаўтаватыя згушчаныя ўчасткі. Пражылкі ў мякаці таксама пры гэтым маюць жоўты колер. А на думку знаўцаў, яны павінны быць толькі белымі.

Здаровы кавун заўсёды іскрыцца крупінкамі, а перакормлены хіміяй — блішчыць на святле. А калі апусціць кавалачак адрэзанай ягады ў шклянку з чыстай вадой і яна пры гэтым памутнее і не афарбуецца ў ружовы ці чырвоны колер, значыць, кавун удалы.

Ужыванне ў ежу «хворага» гіганта можа мець сур'ёзныя наступствы, сярод якіх страўнікава-кішачная дысфункцыя, што асабліва небяспечна для дзяцей. Праблемы са здароўем пачынаюцца з галаўнога болю, галавакружэння, пачырванення твару і шыі, а таксама чырвоных кругоў пад вачыма. Калі пасля ўжывання кавуна з'явілася хоць бы адна з гэтых прыкмет, тэрмінова звяртайцеся па медыцынскую дапамогу.

А вось добрая, спелая, сакавітая ягада не толькі смачны ласунак, яна яшчэ і цудоўная лекарка. Кавун змяшчае цукры, якія лёгка засвойваюцца, — глюкозу і фруктозу, арганічныя кіслоты, калій, жалеза, карацін. Акрамя таго, у кавуне шмат фоліевай кіслаты, клятчаткі, пекцінаў. Ён можа выводзіць з арганізма шчолачную мачу і таму з'яўляецца адным з самых лепшых ачышчальнікаў нырак. Кавун таксама — унікальны прыродны сродак для пазбаўлення ад сімптомаў інтаксікацыі, якая ўзнікла ў выніку якога-небудзь захворвання, атручэння ці істотнай выпіўкі, або іх палягчэння.

Клятчатка мякаці кавуна садзейнічае аднаўленню кішэчнай флоры, паляпшае страваванне і садзейнічае вывядзенню халестэрыну. Дыетолагі раяць праводзіць кавуновыя разгрузачныя дні людзям, якія пакутуюць ад атлусцення, падагры.

Вітаміны і мікраэлементы, наяўнасць вялікай колькасці вады і лёгказасваяльных цукроў даюць магчымасць прымяняць кавуны ў лячэбным харчаванні пры малакроўі, для стабілізацыі абменных працэсаў у печані, кавуны перашкаджаюць камнеўтварэнню ў жоўцевым пузыры, дапамагаюць пры ацёках, звязаных з захворваннямі сардэчна-сасудзістай сістэмы і нырак.

У народнай медыцыне прымяняюць высушаную лупіну, з якой гатуюць адвар у суадносінах 1:10. Свежую ці сухую яе часам выкарыстоўваюць для лячэння калітаў у дзяцей.

Аднак перш чым скарыстаць гаючыя якасці гэтага зялёна-паласатага волата, трэба параіцца з урачом, бо існуюць і супрацьпаказанні для кавуновых дыет. Гэта прыроджаныя анамаліі мочапалавой сферы, адэнома прастаты, пасляаперацыйныя спаечныя працэсы. Не варта захапляцца кавуновымі чысткамі пры наяўнасці ў нырках камянёў вялікіх памераў. Пад уплывам соку кавуна яны могуць, да канца не растварыўшыся, кранууцца з месца, а гэта пагражае ныркавай колікай. Хворым на цукровы дыябет, нават калі ім вельмі хочацца пакаштаваць цукровы цуд, можна ўжываць яго ў вельмі абмежаванай колькасці — з улікам сутачнай нормы цукру.

Дарэчы, тым, хто пакутуе ад мочакаменнай хваробы, не варта цягнуць у сумцы адразу шмат кавуноў — фізічная нагрузка таксама можа выклікаць прыступ ныркавай колікі.

Купіўшы кавун, яго трэба вымыць цёплай вадой з мылам. Гэтая простая мера дапаможа пазбегнуць кішэчнай інфекцыі.

**Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.**

Ключы да здароўя

# АКВАРЫУМ —
## КРЫНІЦА СТАНОЎЧЫХ ЭМОЦЫЙ



**Людзі ўстанаўліваюць дома і на працы акварыумы. Толькі для прыгажосці? Павінна ж быць ад іх хоць нейкая практычная карысць... І яна ёсць, безумоўна!**

А праўда, цікава зазірнуць хоць адным вокам у падводны свет з яго насельнікамі, дзіўнымі раслінамі, незразумелымі законамі? Гэта павольнае плаўнае жыццё загадкавае, прыгожае і цалкам заварожвае. А галоўнае — каб далучыцца да яго, не абавязкова ехаць на цёплыя моры і асвойваць тэхніку дайвінга. Гэты чароўны свет можна стварыць самастойна, насяліць, кім захочацца, і колькі заўгодна потым любавацца.

**КАРЫСНА.** У наш час лячэнне рыбкамі — сусветная псіхалагічная практыка. Чалавек, які любуецца плаўным няспешным жыццём усярэдзіне акварыума, набывае спакой і адчуванне душэўнай раўнавагі, адцягваецца ад трывожных думак. Таму спецыялісты рэкамендуюць заводзіць акварыумы людзям з няўстойлівай псіхікай або як інструмент барацьбы са стрэсам. Таксама вызначана, што назіранне за насельнікамі акварыума на працягу 10—15 хвілін садзейнічае нармалізацыі крывянога ціску, які павысіўся ў выніку нервовага напружання або інтэнсіўнай разумовай дзейнасці.

**БЯСПЕЧНА.** Існуе ходкае меркаванне, што на рыбак можа ўзнікаць алергія. Пацвярджэнняў гэтаму няма. Але вось сухі корм сапраўды з'яўляецца моцным алергенам. У гэтым выпадку можна разгледзець як варыянт іншыя віды кармоў. У астатнім жа акварыумныя рыбкі — самыя бяскрыўдныя з хатніх гадаванцаў.

**ПАВАЖНА.** І дома, і ў рабочым кабінеце дзелавога чалавека акварыум не толькі ўпрыгожвае памяшканне, але і падкрэслівае індывідуальнасць яго ўладальніка. Прыгожы вялікі акварыум не толькі элемент дызайну. Ён, акрамя іншага, сведчыць пра тое, што клопат пра жывых істот не чужы гаспадару.

**ПЕДАГАГІЧНА.** Выхаваўча-адукацыйныя функцыі хатняга акварыума відавочныя. Догляд яго насельнікаў і раслін патрабуе строгай дысцыпліны і акуратнасці. Акрамя таго, для дзяцей гэта — наглядны дапаможнік па біялогіі і заалогіі.

**УТУЛЬНА.** Санітарна-гігіенічныя патрабаванні гавораць пра тое, што аптымальная вільготнасць у жылым памяшканні пры тэмпературы паветра 18—20 °C павінна складаць 40—60 %. Але зімой пры ўключаным ацяпленні яна, безумоўна, значна ніжэйшая. Радыкальна спраўляюцца з праблемай увільгатняльнікі паветра, але некаторыя лічаць, што вялікі акварыум у памяшканні — гэта таксама крыніца вільготнасці паветра.

**НЕ СТРАТНА.** Не пра матэрыяльныя страты гаворка. Якраз на падтрыманне і «развіццё» акварыума патрацішся давядзецца. Мы гаворым пра страты эмацыйныя. Тут не патрабуюцца і не падразумяваюцца стасункі. Рыбкам не трэба зазіраць у вочы і ўгадваць, што ў кожную асобную хвіліну азначае змяненне іх паводзінаў; пра што сведчыць рух хвосціка; не трэба мацаць носік — ён у іх па вызначэнні халодны і мокры, а дакранацца да яго не рэкамендуецца ўвогуле. Рыбы жывуць у сваім асобным свеце, прызначаным для ўпрыгожвання нашага жыцця. Яны не патрабуюць актыўнага ўдзелу людзей у іх жыцці. Гэта імпануе тым, хто цэніць спакой і незалежнасць.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Организация: **СООО «Гипер Микросистема»**
Учетный номер плательщика: **УНП 190504396**
Вид деятельности: **оптовая торговля, услуги**
Организационно-правовая форма: **совместное общество с ограниченной ответственностью**
Орган управления: **юр. лицо без ведомственной подчиненности**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 65А, офис 506**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2009 г.

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства: | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 222 | 282 |
| амортизация | 102 | 31 | 55 |
| остаточная стоимость | 110 | 191 | 227 |
| Нематериальные активы: | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | - | - |
| амортизация | 112 | - | - |
| остаточная стоимость | 120 | - | - |
| Доходные вложения в материальные ценности: | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | - | - |
| амортизация | 122 | - | - |
| остаточная стоимость | 130 | - | - |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 4 | 5 |
| В том числе: | | | |
| незавершенное строительство | 141 | 4 | 4 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | - | 1 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **195** | **232** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 341 | 133 |
| В том числе: | | | |
| сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 19 | 22 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | - | - |
| расходы на реализацию | 214 | 18 | 1 |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 149 | 29 |
| товары отгруженные | 216 | 118 | 42 |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | - | - |
| расходы будущих периодов | 218 | 37 | 39 |
| прочие запасы и затраты | 219 | - | - |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 3 | 1 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | 28 | 28 |
| В том числе: | | | |
| покупателей и заказчиков | 231 | - | - |
| прочая дебиторская задолженность | 232 | 28 | 28 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 4 | 3 |
| В том числе: | | | |
| покупателей и заказчиков | 241 | - | - |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 2 | - |
| по налогам и сборам | 243 | - | 3 |
| по расчетам с персоналом | 244 | - | - |
| разных дебиторов | 245 | 2 | - |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | - | - |
| Расчеты с учредителями | 250 | 5 | - |
| В том числе: | | | |
| по вкладам в уставный фонд | 251 | 5 | - |
| прочие | 252 | - | - |
| Денежные средства | 260 | 19 | 8 |
| В том числе: | | | |
| денежные средства на депозитных счетах | 261 | - | - |
| Финансовые вложения | 270 | - | - |
| Прочие оборотные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **400** | **173** |
| **БАЛАНС (190 + 290)** | **300** | **595** | **406** |

| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 54 | 54 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | - | - |
| Резервный фонд | 420 | - | 1 |
| В том числе: | | | |
| резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | - | 1 |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | - | - |
| Добавочный фонд | 430 | 76 | 82 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | - | - |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | -239 | 45 |
| Целевое финансирование | 460 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 470 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **-109** | **182** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 34 | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **34** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 144 | 70 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 526 | 154 |
| В том числе: | | | |
| перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 455 | 135 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 6 | 2 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 9 | 5 |
| по прочим расчетам с персоналом | 624 | 17 | 7 |
| по налогам и сборам | 625 | 22 | - |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 4 | - |
| по лизинговым платежам | 627 | - | - |
| перед прочими кредиторами | 628 | 13 | 5 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | - | - |
| В том числе: | | | |
| по выплате доходов, дивидендов | 631 | - | - |
| прочая задолженность | 632 | - | - |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **670** | **224** |
| **БАЛАНС (490 + 590 + 690)** | **700** | **595** | **406** |
| Из строки 620: | | | |
| долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | 215 | 46 |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 311 | 108 |

| Активы и обязательства, учитываемые за балансом | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 001 | - | - |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 002 | - | - |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | - | - |
| Товары, принятые на комиссию | 004 | - | - |
| Оборудование, принятое для монтажа | 005 | - | - |
| Бланки строгой отчетности | 006 | - | - |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 008 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 009 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | -30 | -49 |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | - | - |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | - | - |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | - | - |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
### с 1 января по 31 декабря 2009 г.

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 1 257 | 2 140 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 194 | 336 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010 – 011) | 020 | 1 062 | 1 804 |
| Справочно: | | | |
| из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | - | - |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 842 | 1 324 |
| Валовая прибыль (020 – 021 – 030) | 040 | 220 | 480 |
| Управленческие расходы | 050 | 155 | 361 |
| Расходы на реализацию | 060 | 59 | 158 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020 – 030 – 050 – 060)** | **070** | **6** | **-39** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 58 | 316 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | - | - |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080 – 081) | 090 | 58 | 316 |
| В том числе: | | | |
| проценты к получению | 091 | - | - |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | - | - |
| доходы от операций с активами | 093 | - | - |
| прочие операционные доходы | 099 | 58 | 316 |
| Операционные расходы | 100 | 60 | 317 |
| В том числе: | | | |
| проценты к уплате | 101 | - | - |
| расходы от операций с активами | 102 | - | - |
| прочие операционные расходы | 109 | 60 | 317 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090 – 100)** | **120** | **-2** | **-1** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 36 | 52 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | - | - |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130 – 131) | 140 | 36 | 52 |
| Внереализационные расходы | 150 | 108 | 90 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140 – 150)** | **160** | **-72** | **-38** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (± 070 ± 120 ± 160)** | **200** | **-67** | **-78** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 13 | 22 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | 378 | 2 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (± 200 + 210 – 220)** | **240** | **-432** | **-58** |
| Налог на прибыль | 250 | - | - |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 1 | - |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | - | 3 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200 – 250 – 260 – 270)** | **300** | **-69** | **-81** |
| Справочно (из строки 300): | | | |
| сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | - | - |
| Прибыль (убыток) на акцию | 320 | - | - |
| Количество прибыльных организаций / сумма прибыли | 330 | 0/0 | 0/0 |
| Количество убыточных организаций / сумма убытка | 340 | 1/-69 | 1/-81 |

### РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

| Показатель | | За отчетный период | | За аналогичный период предыдущего года | |
|---|---|---|---|---|---|
| наименование | код | доход | расход | доход | расход |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании | 350 | - | - | - | 2 |
| Прибыль (убыток) прошлых лет | 360 | - | - | 2 | - |
| Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств | 370 | - | - | - | - |
| Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте | 380 | 32 | 104 | 50 | 66 |
| Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности | 390 | - | - | - | - |
| Прочие доходы и расходы | 400 | 4 | 4 | - | 22 |
| **ИТОГО** | **500** | **36** | **108** | **52** | **90** |

**Руководитель** **Габеев Е.Л.**

**Главный бухгалтер** **Мирончик Н.В.**

**31 декабря 2009 г.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Працяг тэмы

# Чаму вучань атрымлівае на іспыце ў школе 8-9 балаў з 10, а праз тыдзень на тэсце — 12-15 балаў са 100?..

Пачатак у нумары за 31 ліпеня

## ЗВАНОК У ПЕДУНІВЕРСІТЭТ

### «СЁЛЕТА Ў НАС НЕДАБОР НА ФІЗІКУ І МАТЭМАТЫКУ...»

Чаму будучым настаўнікам можна зрабіцца, здаўшы тэсты на 20-30 балаў? Пра гэта мы запыталіся ў Сяргея ВАСІЛЬЦА, адказнага сакратара прыёмнай камісіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

***— Сяргей Іванавіч, у параўнанні з мінулым годам, якая агульная карціна: ці зменшыўся прахадны бал?***

— Відавочна, зменшыўся на спецыяльнасці «матэматыка», «фізіка». Крышку меншы і на іншых, у параўнанні з мінулым годам.

***— А матэматыка і фізіка — лічбы ёсць ужо нейкія?***

— Лічбаў няма і не будзе, бо мы атрымалі менш заяў, чым у нас маецца бюджэтных месцаў. Конкурсу няма, адсутнічае. Мы так і будзем пісаць у выніках.

***— Атрымліваецца, што ўсе, хто да вас прыйшлі — усе паступяць?***

— Усе паступяць.

***— Сяргей Іванавіч, але нават летась прахадныя балы больш чым здзіўлялі сваёй нізкасцю. Напрыклад, «фізіка» — 154 балы. Атрымліваецца, калі ў вучня атэстат 7 балаў, то яму дастаткова здаць кожны з трох тэстаў прыкладна на 28 балаў... А пасля гэтыя людзі будуць настаўнікамі...***

— Вы ўсё правільна кажаце. Але ж гэтым людзям яшчэ трэба вучыцца 5 гадоў ва ўніверсітэце. На жаль, па гэтых спецыяльнасцях у нас адлічваецца да 30 % студэнтаў. Па фізфаку першакурснікаў адлічылі чалавек трыццаць. Зможа вучыцца — дык зможа, не — дык не. Слабыя студэнты наўрад ці змогуць 5 гадоў вывучаць дакладныя навукі. Жыццё прымусіць забраць дакументы з ВНУ — што мы і назіраем.

***— Але для будучых настаўнікаў прахадны бал 160 з 400 — гэта недапушчальна мала! Чаму так адбываецца?***

— Я не аналітык, а адказны сакратар прыёмнай камісіі... Складанае пытанне — чаму прафесія настаўніка не такая папулярная, як прафесія юрыста, праграміста...

***— Напэўна, таму, што грошай менш плацяць?..***

— Напэўна, і таму. Хоць гэта не поўны адказ, бо ў нас на факультэт дашкольнай адукацыі, дзе ў будучыні заробак таксама будзе невысокі, ёсць конкурс!

## ЗВАНОК ШКОЛЬНЫМ НАСТАЎНІКАМ

**Аляксей Сяргеевіч ВАСІЛЕЎСКІ, мінскі настаўнік фізікі, стаж 13 гадоў:**

### «КАЛІ ВЫКЛАДЧЫК СТАВІЦЬ НІЗКУЮ АДЗНАКУ — ЁН НАЖЫВАЕ САБЕ ПРАБЛЕМЫ»

***— Спадар Аляксей, нашы эксперты гавораць, што школьныя іспыты — гэта буфанада, тэатр. Абвергніце іх, калі можаце.***

— На вялікі жаль, не абвергну. Абсалютна ўсе іспыты ў школе 100 % спісваюцца. Адбываецца ўсё гэта з маўклівай згоды. Ніхто адназначна не кажа: будзеце спісваць. Але намякаецца, што «дзеці, не хвалюйцеся, усё будзе добра». Прычым спісванне фільтруецца, каб вучань не спісаў больш, чым трэба. Але бываюць казусы. Калі я працаваў у іншай школе, на пераказе адзін вучань, у якога была шасцёрка, спісаў адзін у адзін. І настаўніку нічога не заставалася, як паставіць 9 ці 10! Цяпер лічыцца, што прыйсці на іспыт «без нічога» — проста з ручкай — гэта недарэчна. Калі іспыты праводзіць па правілах, ніхто вузкія прадметы кшталту матэматыкі ці фізікі не здасць. Увогуле, калі выкладчык ставіць нізкую адзнаку — ён нажывае сабе праблемы. Пачынаюцца закіды, што ён дрэнна працуе з вучнямі, што не праводзіць дадатковыя заняткі. У гэтым годзе я ўпершыню паставіў дзве «двойкі» за год, хаця ўсяляк папярэджваў вучняў, што так будзе, заклікаў іх вучыцца. Вучні казалі мне ў твар: «Нікуды не падзенецеся, паставіце «тры»!

***— А як вы лічыце, чаму ў вучняў няма шанавання ведаў? Няўжо яны не разумеюць, што ў дурных менш магчымасцяў, чым у разумных?***

— Вельмі шмат ідзе ад бацькоў. Што сям'я заклала, тое і будзе. За ўвесь час працы да мяне толькі адна мама прыйшла спытаць, як справы ў яе дзяцей на ўроках. І тое — гэта была мама добрых вучняў, якая цікавілася, як яшчэ палепшыць іх вынікі. Проста так да мяне ніколі ніхто з бацькоў не прыходзіў. Прыходзілі, калі было ўжо позна, на разборкі: чаго ты «два» паставіў!? А што дзіця падручнік не адкрывала — яны даведваюцца ад мяне, дома ніякага кантролю няма. І на бацькоўскія сходы ходзяць толькі тыя бацькі, у чыіх дзяцей усё добра.

***— Ці праўда, што ў школах няма абсталявання для правядзення доследаў і лабараторных прац?***

— Мінулая школа, дзе я працаваў, была толькі збудаваная — яе ўкамплектавалі па поўнай праграме. На мне, як загадчыку кабінета фізікі, значылася абсталявання на 80 мільёнаў рублёў, па тых коштах гэта 40 тысяч долараў! Пры гэтым большую частку абсталявання можна было адразу выкідаць, бо яна была закупленая бяздумна. Закупілі абсталяванне для лабараторных прац, якія выконваюцца ў тэхнікуме, а не ў школе! Такіх набораў у мяне было па 80 штук. Сапраўды вартых прыбораў было вельмі мала. Усе яны былі расійскай вытворчасці, і прыстасаваныя пад расійскую праграму. У нас гэтага няма ў праграме! У школе, дзе я працую цяпер, практычна нічога няма. Паказваю доследы з лінейкай і ніткай.

***— Да чаго мы прыйдзем далей такім чынам?***

— Да таго, што дзеці будуць рабіць выгляд, што яны вучацца, настаўнікі — рабіць выгляд, што яны вядуць урокі.

**Наталля Уладзіміраўна, настаўніца матэматыкі вышэйшай катэгорыі, стаж 23 гады:**

### «ВУЧНЮ З «МЕДАЛЬНАЙ» РАБОТАЙ КАЖАШ: ПРЫЙДЗЕШ А ШОСТАЙ ГАДЗІНЕ, УСЁ ПЕРАПІШАМ...»

***— Наталля Уладзіміраўна, у чым заключаецца школьны іспыт?***

— У тым, што перад іспытам вучань купляе ўсе гатовыя рашэнні — нават у электронным варыянце, раздрукоўвае колькі камплектаў шпаргалак. Калі на іспыце сядзіць 47 чалавек, як у мяне вось цяпер было, то недзе можна проста не заўважыць, а дзесьці зрабіць выгляд, што не заўважылі. У кожнай школе цяпер ёсць такое паняцце, як рэйтынг навучальнай установы. І калі працэнт высокіх адзнак па нейкім прадмеце нізкі, то цябе зацкуюць праверкамі, будуць пясочыць на педнарадах... У нас ёсць адзін выкладчык біялогіі, які стабільна рыхтуе пераможцаў алімпіяд. І слабым вучням ён ставіць заслужана нізкія ацэнкі. Але і яго «тыцкаюць» на педнарадах. Выкладчыкі ўжо даўно задаюцца пытаннем: каму гэта трэба? У свой час я знарок вызваліла сваю дачку ад іспытаў, зрабіўшы медычную даведку. Каб яна не марнавала час і нервы, а рыхтавалася па трох патрэбных прадметах.

***— Наш эксперт-рэпетытар заявіў, што ўсе «медальныя» працы перапісваюцца ледзьве не ўсёй школай...***

— Гэта чыстая праўда! Каб да гэтай работы ніхто не дачапіўся, настаўнікі сядзяць і вычытваюць яе. Калі ёсць нейкія «шурпатасці» — гаворыш вучню: прыйдзеш а шостай гадзіне — і мы работу перапішам.

***— Вучні спісвалі заўсёды. Чаму гэтая праблема актуалізавалася сёння?***

— Бо пайшлі скаргі бацькоў: як гэта маё дзіця ў школе атрымлівала 9 і 10, а прыйшло на ЦТ — і атрымала 7? А так і ёсць: у нас на іспыце ў школе вучань атрымаў 8, а на тэсце — 27 балаў! Калі шчыра, настаўнікі самі стаміліся ад гэтых нікому не патрэбных іспытаў...

***— Праблема, якую мы абмяркоўваем — каго сёння бяруць у педінстытут...***

— Мне нядаўна патэлефанаваў мой былы вучань. Усміхаецца: «Наталля Уладзіміраўна, хутка будзем калегамі». Ён паступіў у педуніверсітэт, на маю ж спецыяльнасць. Ведаеце, колькі яму хапіла? 142 балы з 400! Хто будзе вучыць маіх унукаў?! Добрыя выкладчыкі сыходзяць у іншую сферу, а дзіркі затыкаюцца выпускнікамі, якіх размяркоўваюць на два гады. Адпрацавалі два гады — на іх месца размеркавалі новых. Таму і бяруць усіх запар, каб было каго ў школы накіроўваць.

***— Колькі атрымліваеце вы, мінскі настаўнік вышэйшай катэгорыі, са стажам 23 гады?***

— Аклад 418 тысяч 218 рублёў. А стаўка 305 тысяч. Каб неяк жыць, я маю не 18 гадзін на тыдзень, як па норме, а 36. У выніку на рукі, з усімі прэміямі і дабаўкамі, атрымліваю 773 тысячы 750 рублёў. Гэта 257 долараў. Таму 24 жніўня — мой апошні дзень працы ў школе, я сыходжу ў рэпетытары.

## ЗВАНОК ВЫКЛАДЧЫКУ ЎНІВЕРСІТЭТА

**Спадар Аркадзь*, выкладчык фізікі, дацэнт БНТУ, раней працаваў у школе:**

### «СТУДЭНТКА СПЫТАЛАСЯ Ў МЯНЕ: «А ЧАМУ, КАЛІ МЫ ЗГІНАЕМ ЭЛЕКТРЫЧНЫ ДРОТ, ТОК ПРАЦЯГВАЕ ІСЦІ?»

— Большасць студэнтаў — добрыя хлопцы і дзяўчаты. Дзесьці яны недавучаныя ў школе, але яны хочуць вучыцца. Хоць у пачатку навучальнага года я некалькі лекцый расказваю ім тое, чаму іх павінны былі вучыць у школе. Ніхто са студэнтаў не можа знайсці час падзення цела з пэўнай вышыні — хоць гэта элементарныя школьныя веды, трэба проста падставіць лічбы ў формулу!

***— Вы працавалі ў школе, вам даводзілася прымаць выпускныя іспыты? Як яны праходзяць?***

— Прывяду вам просты факт. Любому класу ў любой школе кажуць набыць аднолькавыя ручкі перад іспытам. Якія трэба не толькі мець самім, але і аддаць тым настаўнікам, якія будуць правяраць працы. Працягваць? Па вусных іспытах — усе загадзя ведаюць, дзе ляжыць які білет. І я чуў скаргі на «настаўнікаў-садыстаў», якія іх прымушаюць вучыць не адзін білет, а цэлых пяць! У ВНУ «праблема» ў тым, што нават калі іспыт пісьмовы — трэба выходзіць і вусна тлумачыць свой адказ. І вось тут, дзе нельга спісаць, вучань як вады ў рот набірае... Праблема школьных выкладчыкаў, а таксама рэпетытараў: мы не вучым дзяцей фізіцы і матэматыцы. Мы вучым іх рашаць канкрэтныя задачы на тэсце. І вучні развучваюцца думаць, аналізаваць. Ад студэнткі політэха, якая добра здала тэсты і добра вучылася, я аднойчы пачуў шчырае здзіўленне: «А чаму, калі мы згінаем электрычны дрот, ток працягвае ісці, а не ўпіраецца ў месца сугіну?»

***— Дае знак адсутнасць практыкі на занятках?***

— Калі мы вучыліся, у нас было па 30-40 эксперыментаў за год. Цяпер у старэйшых класах — 7-8 эксперыментаў.

* імя зменена.

## ЗВАНОК ВЫПУСКНІКУ ШКОЛЫ

### «У ШКОЛЕ ВУЧАНЬ ЦІ СПІША, ЦІ ЯМУ «НАМАЛЮЮЦЬ» АДЗНАКУ»

А што думаюць вучні? Вінаватыя яны, настаўнікі ці ўся сістэма адукацыі? Пра гэта мы спыталіся ў шараговага выпускніка мінскай школы Валерыя, які ўжо паспеў сёлета паступіць ва ўніверсітэт, здаўшы фізіку на 30 балаў, а матэматыку на 46 (у школе атрымаў 8).

***— Валерый, ці праўда, што на выпускным іспыце ў школе можна спісаць усім, хто хоча?***

— Так — хто захоча, той спіша. Спачатку робяць гэта цішком, спісваюць са шпаргалкі. У некага заўважаць, у некага не заўважаць. Нават у каго заўважылі — не забіралі, не выганялі нікога.

***— Колькі вы атрымалі на школьным іспыце па матэматыцы?***

— 8.

***— Спісвалі?***

— Асабіста я не спісваў, бо сур'ёзна рыхтаваўся, хадзіў нават да рэпетытара.

***— А па тэсце колькі атрымалі?***

— 46.

***— А чаму такая розніца?***

— Быў не самы лёгкі тэст, дастаткова цяжкія задачы. І школьны іспыт пісалі па кніжцы, якая ва ўсіх была, якую рашалі нават на ўроках. Таму школьны іспыт было проста напісаць. Да таго ж, у школе былі заданні толькі за апошні год, а ў тэставанні за ўсю школьную праграму.

***— Увогуле, калі для паступлення трэба бал атэстата і вынікі тэставання, навошта школьны іспыт?***

— Каб навучэнец для адміністрацыі пацвердзіў школьную адзнаку — якую яму ўсё адно альбо «намалююць», альбо ён спіша.

***— А вы ўжо некуды паступілі?***

— Так, у РТІ (БДУІР). Сярэдні бал атэстата меў 77. Здаваў беларускую мову (49 балаў), матэматыку (46) і фізіку (30 балаў). Пашанцавала, што ў гэтым годзе вельмі нізкія агульныя балы за тэставанне.

***— Як вы лічыце, проста пасля школы, без дапамогі рэпетытараў, магчыма паступіць?***

— Калі вучань будзе старацца — магчыма. І калі настаўнік будзе не проста школьную праграму даваць, але праводзіць дадатковыя заняткі, факультатывы, не толькі па падручніках. У нас вось адзін хлопец не хадзіў да рэпетытара — і паступіў на бюджэт.

***— Як вы лічыце, ці добрая і аб'ектыўная сістэма цэнтралізаванага тэставання?***

— Я лічу, што аб'ектыўная. Бо ўсе атрымліваюць аднолькавыя заданні, ва ўсіх аднолькавы час. Там сочаць, каб не спісвалі — калі што, адразу выганяюць.

## ДЛЯ РОЗДУМУ

**Афіцыйныя вынікі цэнтралізаванага тэставання-2010 па некаторых прадметах.**

**Беларуская мова:**
- 90 і вышэй балаў — 336 чалавек (0,51%),
- 80 і вышэй — 1 608 чалавек (2,43%),
- 20 і ніжэй — 22 089 чалавек (33,39%),
- 10 і ніжэй — 5 176 чалавек (7,82%).

**Руская мова:**
- 90 і вышэй балаў — 820 чалавек (0,79%),
- 80 і вышэй — 2 899 чалавек (2,79%),
- 20 і ніжэй — 37 424 чалавекі (36,01%),
- 10 і ніжэй — 9 446 чалавек (9,09%).

**Гісторыя Беларусі:**
- 90 і вышэй балаў — 153 чалавекі (0,62%),
- 80 і вышэй — 538 чалавек (2,20%),
- 20 і ніжэй — 3 381 чалавек (13,79%),
- 10 і ніжэй — 122 чалавекі (0,5%).

**Матэматыка:**
- 90 і вышэй балаў — 243 чалавекі (0,21%),
- 80 і вышэй — 1 148 чалавек (0,99%),
- 20 і ніжэй — 72 148 чалавек (62,45%),
- 10 і ніжэй — 26 705 чалавек (23,12%).

**Сусветная гісторыя найноўшага часу:**
- 90 і вышэй балаў — 8 чалавек (0,38%),
- 80 і вышэй — 56 чалавек (2,68%),
- 20 і ніжэй — 349 чалавек (16,7%),
- 10 і ніжэй — 17 чалавек (0,81%).

**Фізіка:**
- 90 і вышэй балаў — 56 чалавек (0,11%),
- 80 і вышэй — 224 чалавекі (0,44%),
- 20 і ніжэй — 37 282 чалавекі (72,96%),
- 10 і ніжэй — 13 033 чалавекі (25,51%).

**Хімія:**
- 90 і вышэй балаў — 55 чалавек (0,32%),
- 80 і вышэй — 281 чалавек (1,61%),
- 20 і ніжэй — 4 511 чалавек 25,88%),
- 10 і ніжэй — 235 чалавек (1,35%).

## ПРАХАДНЫЯ БАЛЫ Ў ПЕДУНІВЕРСІТЭТ

Звесткі па мінскім педуніверсітэце імя Максіма Танка за 2009 год. Колькасць балаў, дастатковых для таго, каб быць будучым настаўнікам — з 400 магчымых.

**«Фізіка. Матэматыка»**: сельскія вучні 163, гарадскія 165, платнікі 128.
**«Фізіка. Тэхнічная творчасць»**: 154/157/87.
**«Пачатковая адукацыя. Беларуская мова і літаратура»**: 195/238/122.
**«Гісторыя. Замежная мова»**: 173/173/128.
**«Англійская мова. Беларуская мова і літаратура»**: 252/268/162.

## КАМЕНТАР МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ

# «ЗАЛІШНЯЯ ПІСАНІНА НАСТАЎНІКАЎ — ГЭТА ПЕРАСТРАХОЎКА НА МЕСЦАХ»

Каб атрымаць кампетэнтны каментар Міністэрства адукацыі, мы яшчэ да публікацыі пераслалі туды змешчаныя тут каментары настаўнікаў, дацэнта, вучня... Пасля гэтага на пытанні «Звязды» адказала **Валянціна МАЕЎСКАЯ, намесніца начальніка Упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Беларусі**.

***— Валянціна Леанідаўна, многія нашы эксперты кажуць, што выпускныя іспыты ў цяперашняй форме варта ўвогуле адмяніць...***

— Школьныя іспыты патрэбныя нашай сучаснай школе, бо яны выхоўваюць пачуццё адказнасці, што вельмі важна ў педагагічным разуменні. І калі яны нават патрабуюць намаганняў, марнавання сілы і энергіі, хвалявання, у гэтым неабходна бачыць і цудоўную падрыхтоўку да жыцця. Бо жыццё ж не будзе ўсланае ружамі, будуць розныя цяжкасці. Сёння выпускнікі школы здаюць 3 выпускныя іспыты, у 2012-13 гадах мы плануем увесці чацвёрты абавязковы іспыт па замежнай мове — цяпер ідзе падрыхтоўка. Нашы іспыты маюць іншую мэту, чым цэнтралізаванае тэставанне — праверыць, як дасягнутая адукацыйная мэта. Калі казаць пра фізіку, аб якой вядзецца гаворка ў вашым папярэднім матэрыяле, то з 6-га па 11-ы клас у нас цяпер ідзе 385 навучальных гадзін, 41 навучальная гадзіна — на правядзенне франтальных і лабараторных работ. Гэта 10,6 % часу.

***— Валянціна Леанідаўна, вы гаворыце зараз у ідэале — так, як яно павінна быць. А мы гаворым пра тое, як ёсць. Я таксама вучыўся ў школе, і ведаю, якое там было абсталяванне па фізіцы — ніякага. У настаўніка на парце стаяў адзін апарат, на якім ён нешта рабіў і дыктаваў нам, што запісваць у сшыткі. Пра школьны іспыт вы таксама кажаце ў ідэале. Калі б ён сапраўды праходзіў так, усё было б лагічна. Але мы гаворым пра тое, што сёння гэта буфанада — усе спісваюць, і ўсе пра гэта ведаюць.***

— Я не магу падтрымаць вас у гэтых разважаннях, бо школьны іспыт — гэта адказна. У большасці школ да выпускных іспытаў рыхтуюцца сур'ёзна — педагогі, вучні. Бо такі іспыт — гэта выпрабаванне не толькі для вучня, але і для настаўніка. Так, на сёння матэрыяльна-тэхнічная база навучання ў нас недастаткова добрая, патрабуе паляпшэння. Але мы працуем над гэтым. Напрыклад, распрацаваны пералік мінімальнага неабходнага абсталявання. Падключыліся да вытворчасці беларускія прадпрыемствы. За мінулы год выдаткавана 60,8 мільярда рублёў, сёлета — 70 мільярдаў рублёў, у 2011-м плануецца выдаткаваць 81 мільярд рублёў.

***— Але ж вы бачылі прыклад у нашым артыкуле, калі настаўнік фізікі кажа, на што пайшлі 80 мільёнаў рублёў — на непатрэбнае, бессэнсоўнае абсталяванне.***

— Не магу пракаментаваць прыклад абстрактнага настаўніка, бо ў нас канкрэтны пералік неабходнага абсталявання па кожным прадмеце — зацверджаны. І кіраўнік школы мае гэты пералік. Трэба разбірацца, чаму туды было закупленае неадпаведнае абсталяванне. Дарэчы, сітуацыя, калі спасылаюцца на абстрактных, а не канкрэтных настаўнікаў, бацькоў, вучняў, выклікае зразумелае пачуццё недаверу.

***— Валянціна Леанідаўна, першую частку нашага артыкула — гутарку з рэпетытарам Яўгенам Ліўянтам — шырока перадрукавалі ў інтэрнэце. І ніводнага каментара, што там нешта непраўдзіва. Пра якую тады большасць школ вы гаворыце?***

— Пра большасць школ, якую мы правяраем. У нас Дэпартамент кантролю якасці ведаў штогод правярае ходу выпускных іспытаў. І на сёння я маю даведку па выкананні вынікаў кантролю. І нідзе там не прагучала, што былі парушэнні па форме правядзення іспытаў. Не было такіх парушэнняў. А казаць — спісваюць, ці не спісваюць... У нас на іспыце сядзіць камісія 4 чалавекі ў 11-м класе, тры чалавекі — у базавай школе. І калі гэта сумленныя педагогі — дзеці не спішуць.

***— Але ж усе члены камісіі зацікаўленыя, каб вынікі былі высокія! Нашто ім дрэнныя паказчыкі?***

— У нас цяпер ніхто не аналізуе паказчыкі. Пры вызначэнні рэйтынга школы не выстаўляецца ўзровень паспяховасці, цяпер мы гаворым пра «ўзровень навучанасці вучняў». А ён вызначаецца праз узнагароджанні залатым і срэбным медалямі. А ў нас гэта вынікі стабільныя — сёлета 2526, летась 2700 выпускнікоў. Якасць адукацыі ў нас не падае, сведчанне гэтага — перамогі на міжнародных алімпіядах. У гэтым годзе мы прывезлі «золата» па фізіцы з міжнароднай алімпіяды, дзе бралі ўдзел 82 краіны, 364 удзельнікі...

***— Карацей, да гаворкі пра выпускныя іспыты — вы сцвярджаеце, што ўсё ў парадку, што ўсё праводзіцца па поўнай сур'ёзнасці?***

— Я сама брала ўдзел у выпускных іспытах, нават як старшыня камісіі. І лічу, што пры сумленным настаўніку, які клапоціцца пра свой прэстыж, спісвання не будзе. У нас няма сёння прыкладаў, каб звольнілі ці пакаралі настаўніка за нізкія вынікі вучняў. Вынік вучня — гэта шматскладная рэч. Трэба ведаць яго псіхалагічныя асаблівасці. Можа, для яго «шэсць» — як для іншага «дзесяць»?

***— Добра, іспыты закліканыя падсумаваць, чаму навучылі ў школе па канкрэтным прадмеце. А як жа цэнтралізаванае тэставанне, якое таксама правярае, чаму навучылі ў школе? Чаму там такія нізкія вынікі?***

— Яно паказвае рэйтынг вучня ў параўнанні з іншымі, хто здаваў тэст.

***— Вы бачылі вынікі цэнтралізаванага тэставання гэтага года. Па мовах — больш за 40 % вучняў зарабілі менш за 20 балаў. Па фізіцы — 73 %, па матэматыцы — 62,5 %. Менш за 20 балаў — гэта можна пальцам патыкаць і ўгадаць. Вы, як супрацоўнік Міністэрства адукацыі, будзеце сцвярджаць, што гэта добрыя вынікі?***

— Тут нельга казаць у абсалюце. Сістэма падліку такая, што калі на адно і тое пытанне адказала вялікая колькасць людзей — бал будзе ніжэйшы.

***— Але ж не 15-20!***

— Гэта таксама вынік. Такія балы маглі атрымаць тыя, хто скончыў школу раней і не мае цвёрдых ведаў. А можа, прыйшоў «пагуляць» у іспыт. Да таго ж, трэба глядзець, якая сістэма падліка балаў...

***— Вы думаеце, там нешта намахлявалі?***

— Не. Проста такая сістэма падліку, што гэта — не нізкі ўзровень, гэта нармальны ўзровень.

***— Вы праўда так лічыце?***

— Так.

***— Валянціна Леанідаўна, яшчэ адзін аспект, які мы закранаем, — нізкі заробак настаўнікаў. Прыклад ёсць у нас у артыкуле, калі настаўніца вышэйшай катэгорыі, якая мае 23 гады стажу, атрымлівае на рукі, перавыконваючы план, 773 тысячы...***

— Паводле звестак дзяржаўнай статыстыкі, сярэдні заробак настаўнікаў за першае паўгоддзе 2010 года складае 885 тысяч рублёў. Мы ўжо два гады даплачваем маладым спецыялістам...

***— Колькі?***

— Да 100 тысяч штомесяц.

***— Гэта значыць, 33 долары.***

— Але ж і яны з неба не падаюць. За катэгорыю ідзе даплата, прэміяльны фонд існуе... А ў вёсцы адразу 20 % ідзе даплата.

***— Яшчэ надзённае пытанне — каго ў нас бяруць у педуніверсітэты. Маючы крайне нізкія вынікі (120-150 балаў з 400), людзі будуць працаваць настаўнікамі...***

— Гэта праблема, мы працуем над гэтым. Але перш чым стаць настаўнікамі, яны будуць 5 гадоў вучыцца. І калі чалавек паступіў, ён можа самаўдасканаліцца, працаваць над сабой. А калі не будзе добра вучыцца — будзе адлічаны, не здасць сесію.

***— Вы не лічыце, што трэба абмежаваць прахадныя балы для будучых настаўнікаў, каб невукі не ішлі туды?***

— Гэта павінны вырашаць прыёмныя камісіі ВНУ — каго ім вучыць.

***— Валянціна Леанідаўна, на сёлетніх выпускніках выпрабавалі 4 рэформы адукацыі. Колькі яшчэ рэформаў наперадзе?***

— У нас зацверджаны тыпавы вучэбны план, які не будзе змяняцца гадоў 5-7. У нас прайшлі апрабацыю ўсе навучальныя праграмы...

***— Усе настаўнікі, з якімі давялося гутарыць, кажуць, што іх проста завальваюць дурной бюракратычнай пісанінай...***

— Міністэрства адукацыі наадварот вядзе працу па выключэнні залішняга прадукавання паперы ў працы настаўніка. Прыклады кшталту «працоўная акцыя — прыборка кабінета» — гэта перагібы на мясцовым узроўні. Перастараліся. Мы правodзілі аналіз: з 20 справаздачаў, якія патрабуюць з навучальнай установы, толькі 2 — Міністэрства адукацыі. Астатнія — на мясцовым узроўні, перастрахоўваюцца. Мы шмат пра гэта гаворым: настаўнік павінен займацца непасрэдна навучаннем дзяцей. Нам не трэба ўсе гэтыя справаздачы, якія яны пішуць. Неабходна толькі, каб гэта пачулі ўсе кіраўнікі на месцах.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# Ці будуць нам вяртаць банкаўскія ўклады 90-х гадоў?

**З такім пытаннем у нашу рэдакцыю звярнуўся пенсіянер з адной з вёсак Мінскага раёна:**



— Мы клалі грошы на кніжку яшчэ ў савецкі час, мы ж працаўнікі звычайныя, а не нейкія там спекулянты: ці будуць нам выплачваць гэтыя ўклады? Я пытаў у ашчадкасе, але мне нічога не адказалі, сказалі, што не ведаюць...

Відаць, у Нацыянальны банк з аналагічнымі пытаннямі звяртаюцца даволі часта, таму што на афіцыйнай старонцы Нацбанка ў раздзеле «Часта задаваныя пытанні» змешчаны артыкул «Аб кампенсацыі ўкладаў савецкага перыяду».

У прыватнасці, там напісана, што згодна з падпісаным у 1992 годзе пагадненнем запазычанасць Ашчаднага банка СССР перад насельніцтвам па ўкладах была афармлена кожнай краінай як унутраны дзяржаўны доўг, а ўсе выдаткі з 1 студзеня 1992 года робяцца за кошт дзяржаўных бюджэтаў. З-за інтэнсіўных інфляцыйных працэсаў у пачатку 90-х гадоў ва ўсіх былых краінах СССР, у тым ліку ў Беларусі, адбылося рэзкае абясцэньванне грашовых сродкаў як прадпрыемстваў, так і ўкладаў насельніцтва ў банках. Акрамя таго, на намінальную велічыню паўплывалі дзве дэнамінацыі беларускага рубля — у 10 разоў у 1994 годзе і ў 1000 разоў у 2000 годзе. Згодна з прынятымі рашэннямі па ўсіх рахунках юрыдычных і фізічных асобаў у гэтыя часы былі зроблены перараздзікі ў бок памяншэння, у тым ліку і ўкладаў насельніцтва.

А што наконт кампенсацыі ўкладаў? Там жа, на афіцыйным сайце Нацбанка, напісана, што «ў нашай рэспубліцы, пачынаючы з 1991 года, на падставе рашэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Урада Рэспублікі Беларусь неаднаразова праводзіліся мерапрыемствы па аднаўленні зберажэнняў, якія раней былі размешчаныя ва ўклады і абясцэніліся ў выніку інфляцыі». Такім чынам, у 1991 годзе была праведзена кампенсацыя ўкладаў шляхам павелічэння на 40 % іх рэштак, у 1992 годзе на індэкс спажывецкіх цэнаў (19,3 %) была праведзена карэкціроўка сум укладаў, меншых за 10 тысяч рублёў, у 1993 годзе рэшткі ўкладаў па стане на 1 студзеня 1991 года сумай да 1 тысячы рублёў былі павялічаны ў 5 разоў, а рэшткі ўкладаў звыш 1 тысячы рублёў — на 4 тысячы. У 1994 годзе была зроблена разавая кампенсацыя ўкладаў шляхам павелічэння ў 10 разоў іх рэштак па стане на 1 студзеня 1992 года, ну а ў 1996—1997 гадах у 1000 разоў былі павялічаны рэшткі ўкладаў на 1 студзеня 1992 года ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

Як далей напісана на сайце Нацбанка, «апошні этап кампенсацыйных выплат ажыццяўляўся ААТ «АСБ Беларусбанк» у выкананне Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 21.04.1998 № 229 з 1998 па 2007 год уключна. Выплаты, згодна з Указам № 229, рабіліся ўсім укладчыкам і спадчыннікам, якія мелі ўклады ў перыяд з 01.01.1992 па 01.01.1995. Аднак з-за таго, што сума кампенсацыі разлічвалася з ўлікам росту індэксу спажывецкіх цэнаў толькі да 01.01.1996, выплачаны памер кампенсацыі быў нязначны... Сёння ААТ «АСБ Беларусбанк» выплачвае ўклады пазначанага перыяду без уліку налічанай у адпаведнасці з Указам № 299 кампенсацыі. З-за інфляцыйнага абясцэньвання ўкладаў, а таксама змянення маштабу грашовай адзінкі ў выніку праведзеных дэнамінацый, па большасці рахункаў рэшткі ўкладаў складаюць нязначныя сумы», — адзначаецца на афіцыйным інтэрнэт-рэсурсе Нацыянальнага банка.

Як патлумачылі «Звяздзе» ў прэс-службе Нацбанка, рашэнне пытання аб кампенсацыі насельніцтву інфляцыйных страт па ўкладах савецкага перыяду застаецца актуальным і можа быць прынятае на ўзроўні Прэзідэнта і Урада, але толькі пры наяўнасці сродкаў для гэтых выплат у неабходных аб'ёмах.

Таксама мы яшчэ звярнуліся з пытаннем нашага чытача да старшыні праўлення ААТ «АСБ Беларусбанк» Надзеі Ермаковай:

— Я не магу сказаць, калі гэта будзе, але веру, што гэта павінна быць. Стан нашай эканомікі сёння такі, што няма грошай, каб вярнуць. Хоць якраз напярэдадні крызісу былі прапрацаваныя чатыры варыянты: яны былі разгледжаны ва ўрадзе і павінны былі разглядацца ў Прэзідэнта. Але тут зваліўся крызіс, усё закруцілася-завярцелася і атрымалася так, як атрымалася, — адказала Надзея Ермакова.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# Аблігацыі «Пріорбанк» ААТ 17 і 18 выпускаў ужо ў продажы

**«Пріорбанк» ААТ пачаў продаж аблігацый 17 і 18 выпускаў для юрыдычных асобаў. Выпускі забяспечаны ўласным капіталам банка.**

Сума эмісіі выпускаў аблігацый «Пріорбанк» ААТ складае 100 млрд беларускіх рублёў. Намінальны кошт адной аблігацыі — 100 тыс. рублёў. Пры пярвічным размяшчэнні даход па аблігацыях устанаўліваецца ў памеры: стаўка рэфінансавання НБ РБ мінус 1 працэнт гадавых (10,5 працэнта), што аналагічна 13,82 працэнтам гадавых па дэпазіце. Тэрмін звароту 17 і 18 выпускаў 1096 і 1188 дзён адпаведна. Размяшчэнне будзе ажыццяўляцца да 2 лютага 2011 года і 2 мая 2011 года шляхам адкрытага продажу. Пасля гэтага часу аблігацыі будуць абарачацца на другасным рынку.

Прывабнасць аблігацый для інвестараў забяспечваецца тым, што даходы, атрыманыя ад рэалізацыі і пагашэння аблігацый, вызваляюцца ад абкладання падаткам на даходы, а таксама магчымасцю ўпраўлення тэрмінамі інвеставання шляхам ажыццяўлення здзелак з такімі аблігацыямі на другасным рынку.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць штодня, акрамя выхадных і святочных дзён, у «Пріорбанк» ААТ па нумары: (017) 289 92 32.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Хацеў замесці сляды?

Да жыхара вёскі Белавуша Столінскага раёна праз акно ўлез злодзей і прыхапіў, што бліжэй ляжала: дывановую дарожку, упакоўку пральнага парашку, два слоікі кансерваваных агуркоў... а таксама мятлу. Можа, каб замесці сляды. Але ўсё адно супрацоўнікі міліцыі ўстанавілі, што крадзеж учыніў 43-гадовы непрацуючы аднавясковец пацярпелага.

**Яна СВЕТАВА.**


## МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

## СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

### по продаже земельных участков в частную собственность в г. Могилеве

**Аукцион состоится 13 августа 2010 года в 16.30** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни **с 8.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений **– 9.08.2010** года до 17.00.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон, желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) заверенную копию квитанции о **внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3642017441709** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**; б) документ, удостоверяющий личность **(паспорт)** покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **паспорт и нотариально заверенную доверенность**.

Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с ПСД за счет бюджета города. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения. Граждане, желающие участвовать в аукционе по нескольким лотам, вносят **задаток** в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой.

**Победители аукциона обязаны:** в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 4 миллиона рублей.

| № Лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Стоимость землеустроительного дела (руб.) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | переулок 1-й Ровчакова, 1 | 0,0921 | 740100000001004766 | 448 544 | 17 180 000 | 1 546 000 |
| Лот № 2 | переулок 1-й Ровчакова, 5 | 0,0938 | 740100000001004768 | 448 544 | 17 497 000 | 1 575 000 |
| Лот № 3 | переулок 1-й Ровчакова, 7 | 0,0942 | 740100000001004769 | 448 544 | 17 572 000 | 1 581 000 |
| Лот № 4 | переулок 1-й Ровчакова, 9 | 0,0946 | 740100000001004770 | 453 364 | 17 647 000 | 1 588 000 |
| Лот № 5 | переулок 1-й Ровчакова, 11 | 0,0973 | 740100000001004771 | 448 544 | 18 150 000 | 1 634 000 |
| Лот № 6 | переулок 2-й Ровчакова, 2 | 0,0990 | 740100000001004774 | 448 544 | 17 937 000 | 1 614 000 |
| Лот № 7 | переулок 2-й Ровчакова, 4 | 0,0986 | 740100000001004776 | 448 544 | 17 865 000 | 1 608 000 |
| Лот № 8 | переулок 2-й Ровчакова, 10 | 0,1074 | 740100000001004781 | 448 544 | 19 459 000 | 1 751 000 |
| Лот № 9 | переулок 3-й Ровчакова, 4 | 0,0998 | 740100000001004783 | 448 544 | 18 082 000 | 1 627 000 |
| Лот № 10 | переулок 3-й Ровчакова, 6 | 0,0972 | 740100000001004784 | 461 519 | 17 611 000 | 1 585 000 |
| Лот № 11 | переулок 1-й Сараканайский, 7 | 0,0932 | 740100000001004765 | 448 544 | 16 886 000 | 1 520 000 |

**Контактный телефон в г. Могилеве 22-11-63**

